Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ВЕРАСЕНЬ 20 1933 г. СЕРАДА № 208 (4752) Год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Сакратарам гаркомаў і райкомаў КП(б)Б

Зліянне органаў Наркампрацы з прафсаюзамі мае велізарнае палітычнае значэнне

Забяспечце практычную дапамогу прафсаюзам у зліянні, перадачы кадраў, маемасці і ўмацаванні кіраўніцтва

22-га верасня арганізуйце прафпалітдзень на ўсіх прадпрыемствах, совгасах, МТС і ўстановах па пытанні папулярызацыі рашэння СНК і УсеЦСПС.

ГІКАЛО.

ПАКОНЧЫЦЬ З БЕЗДАРОЖЖАМ

На фоне велізарных перамог, атрыманых у выніку закіпяўлення генеральнай лініі нашай партыі, асабліва рэльефна выпукляюцца адсталыя ўчасткі. Адным з такіх адсталых участкаў з'яўляецца дарожная будаўніцтва.

Царская Расія пакінула ў спадчыну вынікова дрэнныя дарогі. Яна не клапацілася аб іх будаўніцтве і рамонце. Гэта і зразумела, бо ў бездарожнай краіне лягчэй было насаджваць цэмру, безкультур'е.

Толькі совецкая ўлада ўзялася па-сапраўднаму за дарожныя справы. Перадпом наступіў у перыяд першай пяцігодкі. Пабудова шасейнай магістралі Менск — Магілеў, будаўніцтва дарогі Менск — Орша — велізарныя дасягненні для БССР. Аднак, гэта толькі казначная частка таго, што трэба зрабіць. Інтарэсы народнай гаспадаркі вымагаюць больш шпаркіх тэмпаў разгортвання дарожных работ, бо дрэнная дарога — гэта перш за ўсё мільёны рублёў страт для народнай гаспадаркі, гэта тормаз для эканамічнага і культурнага развіцця краіны, для ліквідацыі нераўнамернасці паміж горадам і вёскай, для тэхнічнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, гэта тормаз для ўзмоцненнай абароназдольнасці краіны. Дрэнная дарога, апрача ўсяго вышэйсказанага, ёсць перашкода хутчэйшаму выкананню гаспадарча-палітычных кампаній па ўборцы, збожжаздачы, паскарэнню тавараабароту і інш. Іменна так стаіць пытанне. Вузкалобыя дэпягі не разумеюць, што дарожная справа, гэта не дробязнае пытанне, на якое можна не зварачаць увагі. Толькі ў выніку выпустошвання попітычнага значэння справы дарожнага будаўніцтва, у выніку недаацэнкі яго мы маем у радзе раёнаў правал праграмы работ.

Кожны дзень наша краіна ўзбагачаецца новымі тысячамі трактароў і аўтамабіляў, якія выходзяць з канвеераў Харкаўскага і Сталінградскага трактарных заводаў, Горкаўскага аўтагіганта, Масцоўскага завода імя Сталіна і інш. Хутка не будзе такога кутка ў нашай краіне, дзе-б па дарогах не ходзілі грузавыя і легкавыя аўтамабілі, дзе-б на соцыялістычных палях не працавалі трактары і іншыя складаныя сельскагаспадарчыя машыны. Зусім яна, што тэхнічная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі немагчыма без добрых дарог. Недарма XVII усесаюзная партканферэнцыя дала дырэктыву на другую пяцігодку: «ПА ДАРОЖНАМУ І ШАСЕЙНАМУ БУДАЎНІЦТВУ І АЎТАМАБІЛІЗАЦЫІ ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ БОЛЬШ ХУТКІ ТОМП РАЗВІЦЦЯ, ЧЫМ ПА ІНШЫХ ВІДАХ ТРАНСПАРТА».

Барацьба за выкананне і перавыкананне планаў дарожнага будаўніцтва — важнейшая задача партыйных, совецкіх, комсамольскіх і грамадскіх арганізацый.

Як стаіць з гэтай справа ў нас? Трэба сказаць, што зусім нездавальняюча. Абвешчаны ЦК КП(б)Б 28 жніўня двух дэкадзнік штурма, як гэта канстатуецца ў пастанове ЦК КП(б)Б ад 16 верасня, фактычна правалены. «... Рэд райкомаў КП(б)Б (Копыль, Слуцак, Старыя Дарогі, Орша, Талачын, Асіпавічы, Дзяржынск, Смалявічы, Барысаў, Мазыр, Лагойск, Заслаўе, Сіроціна, Бабруйск і інш.) абмежаваліся фармальным вынясеннем рашэнняў па гэтых пытаннях (па дарбудаўніцтве—РЭД.) і не забяспечылі сапраўднага пераломa ў справе выхада рабгужсілы на дарбудаўніцтва». Іменна ў выніку фармальнага падыхода раённых арганізацый, бяздзейнасці РК КП(б)Б і дарожных арганізацый, адсутнасці масавай работы і канкрэтнага кіраўніцтва план скарыстання працудзела насельніцтва на 10-е верасня выканан па БССР усяго на 75,8 проц.

Арганізацыі памянёных раёнаў не здолелі спалучыць асноўныя кампаніі па большэвіцкаму правядзенню ўборкі, збожжаздачы і асенняй сяўбы з дарожным будаўніцтвам.

Спасыпанні асобных раёнаў (Асіпавіцкі — сакратар РК НОВІКАЎ) на нерэальнасць і непасільнасць планаў — апартуністычныя разважанні. Іх разбіваюць бліскучыя прыклады работы перадавых раёнаў — ЛУХАВІЦКАГА, ЛЁЗНЕНСКАГА, БЕШАНКОВІЦКАГА, ПОЛАЦКАГА і ЧЭРВЕНСКАГА, якія не толькі выканалі, але і перавыканалі планы работ. Такія вынікі атрыманы на аснове шырокай масава-палітычнай работы, жывога аперацыйнага кіраўніцтва з боку раённых арганізацый. Там-жа, дзе масавай работы няма, дзе спадзяюцца на сілу паляроваго загада ці рэзалюцыі, дзе справай не кіруюць па-эперацыйнаму, канкрэтна, там бясспрэчна і прарывы.

«Звязда» ўжо не раз указвала на падобныя факты. Вось, напр., БАБРУЙСКІ раён. Там замест большэвіцкай мабілізацыі мас на дарожнае будаўніцтва РК і РВК абмяжоўваюцца тым, што амаль кожную дэкаду выбясць прыгожыя рэзалюцыі, не забяспечваючы адных, іх выканання. У выніку — 40 проц. дарог непраезджых. У ЧАВУСКІМ рабіце пад носам у раённых арганізацый група жулікаў і «очистирателей» правальвала дарожнае будаўніцтва, растрачвала дзяржаўныя сродкі. Гэта просты вынік таго, што РК і РВК перадаверылі важнейшы ўчастак работы, на наладзіні ўласнага жывога аперацыйнага кіраўніцтва і кантроля правядзення работ.

Усебеларуская радыё-перакліч па дарбудаўніцтве, якая ўчора правялі ЦКК КП(б)Б, «Звязда» і Глаўдарпрэсам, паказала, што ў радзе раёнаў (СІРОЦІНСКІМ, АСІПАВІЦКІМ, МАЗЫРСКІМ і інш.) толькі зараз маркуюць штосьці рабіць, складаюць планы, выносяць пастановы, але практычнай работы вельмі мала. Асабліва слабы ўдзел комсамольскіх арганізацый, ячэек Аўтодора і раённага друку. Узлітыя комсамолем на сябе абавязацельствы выкоўваюцца назвычай дрэнна.

Асобна аб пад'язных шляхах да чыгуначных станцый. На гэтую частку работы трэба было звярнуць першачарговую ўвагу. Між тым, пад'язныя шляхі ў многіх раёнах засталіся непраезджымі, загарадзіўшы шлях прыпадку новага ўраджая. У некаторых выпадках цэлыя раёны засталіся адрэзанымі ад чыгуначных станцый. Так, напрыклад, несваячасовае скончанне тракта Барысаў — Зембін затрымала перавозкі з Бягомльскага, Плешчаніцкага і пляці сельсоветаў Барысаўскага раёна, бо памянёны тракт з'яўляецца асноўнай дарогай да чыгуначнай станцыі. Між тым, Барысаўскія арганізацыі, якія канкрэтна вінаваты ў зацяжцы рамонта, гэта асабліва не турбуе. Тое-ж самае з дарогай Слуцак — Цімкавічы, якая адрэзала шлях да чыгункі КАПЫЛЬСКАМУ раёну. Становішча дарог. Случчыны такое, што яны могуць стаць тормазам падвозкі бульбы да чыгуначных станцый з ЧЫРВОНАСЛАБОДСКАГА, СТАРОБІНСКАГА і ЛЮБАНСКАГА раёнаў. Няспраўны і пад'езд да ГОМЕЛЯ з боку Рэчыцы. У 6 кілометрах ад горада няма маста. Гэта затрудняе падвозку збожжа да станцыі.

Давялі і гэтых прыкладаў, каб указаць, што справа з рамонтам пад'язных шляхоў стаіць выключна дрэнна. З такім становішчам нельга мірыцца ні адной мінуты. Пад'язныя шляхі павінны быць у першую чаргу прыведзены ў праезджы стан.

ЦК КП(б)Б прадоўжыў двухдэкадзнік дарожнага будаўніцтва да 1-га кастрычніка. Часу засталося мала. Трэба скарыстаць пітаральна кожную гадзіну, каб поўнасцю закончыць праграму дарожных работ. Пры гэтым нельга выпускаць з віду якасці. Сігналы з АДПР 4 («Звязда» № 204) паказваюць, што не ўсюды зварачаюць патрэбную ўвагу на гэту спрэву.

Каб захаваць на больш доўгі час пабудаваныя і адрэмантаваныя дарогі, трэба наладзіць пастаянны нагляд за імі. У гэтай справе важнейшае значэнне мае пастанова СНК БССР аб прымацаванні асобных участкаў дарог да сельсоветаў, калгасаў, совгасаў, МТС і вёсак для пастаяннага ўтрымання. Ліквідацыя абзіпічкі ў дарожнай гаспадарцы забяспечыць пастаянны праезд па дарогах БССР.

Часу засталося мала, а работы шмат. Задача раённых арганізацый па большэвіцкаму мабілізацыі і да 1-га кастрычніка прывесці дарогі ў спраўны стан. Важнейшымі ўмовамі гэтага з'яўляюцца масава-растлумачальная работа, правільнае расстаноўка сіл, забяспечанне матэрыяльнай прадукцыйнасці кожнай рабочай адзінкі і інш.

ЦК абавязаў сакратароў РК КП(б)Б асабіста прасочваць ход работ і асабіста кіраваць імі. Не лішнім будзе напомнім, што ЦК у сваёй пастанове проста папярэдзіў сакратароў РК КП(б)Б і начальнікаў дарбудучасткаў, што «ў выпадку нестарэння перапома ў справе забеспячэння скончэння дарбудаўніцтва ЦК КП(б)Б будзе вымушан ў адносінах да адстаючых прыняць рашучыя меры узвышэння».

ПА-БОЛЬШЭВІЦКУ РЭАЛІЗУЕМ ПАСТАНОВУ ЦК КП(б)Б. РАЗГРАМІМ САБАТАЖНІКАЎ ДАРОЖНАГА БУДАЎНІЦТВА, ВЫКРЫЕМ КУЛАЦКУЮ АГІТАЦЫЮ, НАКІРАВАНУЮ НА ЗРЫЎ ДАРОЖНЫХ РАБОТ. ШЫРОКАЙ МАСАВАЙ РАБОТАЙ, СОЦЫЯЛІСТЫЧНЫМ СПАБОРНІЦТВАМ ЗАБЯСПЕЧЫМ УДАРНАЕ ЗАВЯРШЭННЕ ПРАГРАМЫ. БССР ПАВІННА І. БУДЗЕ МЕЦЬ ДОБРЫЯ ДАРОГІ.

У РЭЧЫЦЫ І УШАЧАХ ГРУБА ІГНАРУЕЦЦА ЯКАСЦЬ СЯЎБЫ

ДА АДКАЗНАСЦІ ПАРУШАЛЬНІКАЎ ЭЛЕМЕНТАРНЫХ ПРАВІЛ АГРАТЭХНІКІ

БССР НА 15 ВЕРАСНЯ

Зжата збожжавых	— 86,1
Звезена	— 92,4
Абмалочана	— 39,5
Выцераблена ільну	— 93,2
Абмалочана ільну	— 53,7
Разаслана	— 43,5
Засеяна азімых	— 56,3
Засеяна пшаніцы	— 38,1
Паднята зяблева	— 8,3
Убрана бульбы	— 2,5
Выканан гадавы план збожжапаставак	— 50,0
Выкананы бульбапастаўкі	— 2,0

ЗАХ. ВОБЛАСЦЬ НА 15 ВЕРАСНЯ

Зжата збожжавых	— 84,2
Звезена	— 85,2
Абмалочана	— 62,3
Выцераблена ільну	— 98,2
Абмалочана ільну і разаслана	— 57,2
Засеяна азімых	— 85,1
Засеяна пшаніцы	— 78,5
Паднята зяблева	— 7,5
Убрана бульбы	— 3,6
Выканан гадавы план збожжапаставак	— 55,0
Выкананы бульбапастаўкі	— 3,4

Ураджай будучага года пад ударам

РЭЧЫЦА. (Наш кар.).

Рэчыцкая МТС злачынна зацягвае сяўбу. На 15 верасня засеяна толькі 59,9 азімата кліна. Пшаніцы засеяна 53,3.

Загадчыкі вытворчых участкаў МТС, замест мабілізацыі калгасных мас па хутчэйшае скончэнне сяўбы, апынуліся ў палоне адсталай часткі калгаснікаў і кулацкіх агентаў. Слуба пшаніцы ігнаруецца.

Вось калгас **«Гігант»** мае свабоднага папару 75 га, а пшаніцы засеяў толькі 33 га. Калгас **«Чырвоны сцяг»** мае 65 га папару, засеяў толькі 35 га. Калгас **«Чырвоны змагар»** павінен засеяць 35 га пшаніцы, свабодная папару ёсць 20 га, а засеяна ўсяго 5 га.

— У калгасах няма пасевнага пшаніцы — скардзяцца загадчыкі участкаў. У той-жа час яны нічога канкрэтнага не зрабілі, каб арганізаваць міжкалгасны абмен. Між тым пшаніцу не сеюць нават у тых калгасах, якія сеялі яе летась, а сёлета ўбіралі і малацілі. **Пшаніцу проста разбазараюць на спажывецкія патрэбы.**

Возьмем калгас **імя Калініна.** Ён павінен засеяць 120 га пшаніцы, засеяна-ж 19,9 га. Калгас **імя Дзяржынскага** замест 42 га, засеяў толькі 12 га. Калгасы **«Чырвоны сцяг», «Новае жыццё», «Свет», «Беларусь»** не засеялі ні адзнаго га пшаніцы, не гледзячы на тое, што яны забяспечаны насеннем.

Агратэхнічны персанал МТС не вядзе барацьбы за якасць сяўбы, за павышэнне ўраджайнасці. У ўсіх калгасах. У радзе калгасаў, абслугоўваемых МТС, парушаюцца элементарныя правілы агратэхнікі.

Калгас **«Гігант»**, напрыклад, мае дзве радковыя сявяркі. Не гледзячы на гэта, у калгасе сеюць выключна ўручную, а сявяркі стаяць у хлеве. Такое-ж становішча не толькі ў «Гіганце». Радковыя сявяркі скарыстоўваюцца не больш, як на 10 проц. У радзе калгасаў не ведаюць, як карыстацца сявяркамі, як іх устанавіць і адрэгуляваць.

Трактарны парк працуе з рук вон дрэнна. Трактары з-за розных дробязей больш стаяць, чым працуюць. На артыкаўскім участку трактары выканалі вытворчы план толькі на 8,8 проц., а гаручае перавыдаткавалі на 60 проц. На гэтым участку па два дні трацяць на тое, каб завезці трактар. На холмідкім участку трактары выканалі вытворчы план толькі на 17 проц., гаручае перавыдаткавалі на 41 проц.

Дырэкцыя рэчыцкай МТС кіраўніцтва сяўбой пакінула на самацёк. У радзе калгасаў, у выніку грубейшага ігнаравання элементарных правіл агратэхнікі і зацягвання сяўбы, ураджай будучага года пастаўлен пад удар.

Жыта—па жыту

УШАЧЫ. Пытанні якасці сяўбы азімых чамусці выпалі з'пад увагі раённых арганізацый. У калгасах і вёсках парушаюць рад прасцейшых агратэхнічных правіл, ад якіх залежыць ураджай будучага года,—сеюць жыта па жыту, па аўсу, ігнаруюць радковыя сявяркі і т. д.

У калгасе **«Чырвоны Кастрычнік»** радковая сявярка не скарыстоўваецца, сеюць уручную. Старшыня калгаса «Ярмак» актыўна выступае супроць механізацыі калгаснай вытворчасці. У часе перапалення ільна Ярмак, каб сарваць скарыстанне ільнацерабілак, не даў коняй. Зараз Ярмак выступае супроць радковай сяўбы.

У сельска-гаспадарчай арцелі **«Бязбожнік»** брыгадзір Пугач сее пашкодніцку. Ужо больш тыдня тут засеяна два га жыта, якое дагэтуль не забаранавана. Азімыя пачалі ўжо ўсыходзіць. Ні сельсавет, ні партыйная група не рэагуюць на гэтыя шкодніцкія акты.

Адпасобнікі вёскі Бугрынкі, якія падпалі пад уплыў кулацкіх элементаў, сеюць азімыя па жыту, не гледзячы на тое, што ёсць лепшыя папярэднікі з яравых, як віка, гарох і ячмень.

Раённыя арганізацыі не змагаюцца за якасць сяўбы.

Раёны, якія зрываюць уборку яравых

РАЁН	Зжата ў проц.	Звезена з поля ў проц. ад зжатага
АСВЕЙСКІ	30,6	17,7
БЕШАНКОВІЦКІ	35,7	20,5
ГАРАДОЦКІ	35,6	24,0
ДУБРОВЕНСКІ	38,2	24,3
РАСОНСКІ	43,6	13,8
СУРАЖСКІ	43,7	3,5

Перадавікі ўборкі яравых

РАЁН	Зжата ў проц.	Звезена з поля ў проц. ад зжатага
Ч.-СЛАБОДСКІ	100,0	97,2
УШАЦКІ	100,0	90,0

НІ МІНУТЫ ПРАСТОЯ РАДКОВЫХ СЯВЯРАК!

Мы дабіліся вялізарнейшых поспехаў у справе механізацыі сельскай гаспадаркі. На змену сахе, лукошку прыходзіць трактар, сявярка, ільнацерабілка, бульбакапалка і рад іншых складаных сельска-гаспадарчых машын, якія ствараюць рэволюцыю ў сельскай гаспадарцы, невымерна павышаюць прадукцыйнасць працы, паліпшаюць якасць апрацоўкі глебы і спрыяюць паляпшэнню ўраджайнасці соцыялістычных палёў.

Велізарны парк трактараў, малатарань, сявярак і іншых сельска-гаспадарчых машын, якія пертым і ўрад накіроўваюць у вёску, патрабуе да сябе выключнай увагі, бярэжлівых адносін і ўмелага скарыстання. Задача заключаецца ў тым, каб правільна скарыстаць кожную машыну, даць ёй максімальную нагрузку. Толькі пры гэтай умове мы атрымаем адпаведны эфект.

Гэтага, аднак, не зразумелі яшчэ многія кіраўнікі нашых раённых арганізацый, многія дырэктары МТС і совгасаў.

Антымеханізатарскія тэндэнцыі, на веснім контр-рэвалюцыйнымі нацдэмкамі, у БССР яшчэ не зломлены. Пры кожнай сельска-гаспадарчай кампаніі мы маем рэцыдывы гэтых антымеханізатарскіх настрояў.

У часе ўборкі ільна мы мелі просты сабатаж ільнацерабілак. У калгасах ільнаводчых МТС мы маем 1098 ільнацерабілак, якія амаль увесь сезон прастаялі. План уборкі ільна ільнацерабілкамі выкананы усяго на 8,5 проц.

Перавага ільнацерабілкі даказана на практыцы. Ва ўмелых і пазейных руках ільнацерабілка дае вялікі эфект, павышае прадукцыйнасць працы, аблягчае працу калгасніка і калгаснікі. Аб гэтым не раз са старонак «Звязды» гаварылі лепшыя ўдарнікі соцыялістычнага ільнаводства.

Уся справа ў тым, што ільнацерабілка патрабуе да сябе ўважлівых адносін. Трэба ўмець адрэгуляваць машыну, выбраць для яе належны ўчастак, пасадзіць на ільнацерабілку ўмелага, адданага работніка.

Як-жа атрымалася ў вас?

У мінулым годзе шкоднікі, якія сядзелі ў ільнатрактарацэнтры, немала папрацавалі над тым, каб сарваць механізацыю ільнаводства, каб скампраметаваць ільнацерабілку. Рэшткі шкодніцтва яшчэ не выкарчаваны і па сёнешні дзень. Бо чым іншым можна вытлумачыць той факт, што амаль ва ўсіх ільнаводных раёнах не былі падрыхтаваны кваліфікаваныя кадры ільнацерабілышчыкаў. На ільнацерабілках фактычна некаму было працаваць.

За зрыў падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў ільнацерабілышчыкаў перш за ўсё адказвае **Ільнатрактарацэнтр**, у апараце якога як у цэнтры, так і на месцах **дагэтуль яшчэ не зломлены антымеханізатарскія тэндэнцыі.**

Такі-ж малюнак зараз наглядаецца і пры далейшых працэсах апрацоўкі ільна. Машына Гільштэйна не скарыстоўваецца, галоўкі зрэзаюцца сярпамі, абіваюцца тупой рыдлёўкай.

Няма патрэбы даводзіць, што радковая сявярка ў паўтары-два разы на вышэй прадукцыйнасць працы, да 10 проц. павышае ўраджайнасць, паляпшае сатую якасць сяўбы, эканоміць пасеўны матэрыял.

І ўсё-ж не гледзячы на відавочнасць гэтага, на палёх азімага кліна мы зноў сустракаемся з антымеханізатарскімі тэндэнцыямі.

У калгасах БССР ёсць каля 7 тыс. радковых сявярак. Пры правільным і ўмелым іх скарыстанні мы павінны атрымаць вялізарнейшы эфект.

Аб чым-жа сігналізуюць весткі з многіх раёнаў?

Радковыя сявяркі стаяць у хлявох, пад навесамі, на складах, іржавеюць, псуюцца — а сеюць выключна ўручную.

Вось вам кароткі пералік фактаў толькі за апошнія 5-7 дзён.

Ва Ўвараўіцкім раёне ў калгасах **«Вольная праца», «Чырвоны Кастрычнік», імя Варашылава** і інш. усе радковыя сявяркі стаяць, сяўба праводзіцца выключна ручным спосабам. У раённым цэнтры ўжо каторы час на складзе Белсельснаба стаяць 5 дыскавых сявярак, ніхто іх не забірае, машыны іржавеюць. Не гледзячы на адкрыты сабатаж радковай сяўбы, райземаддзел зусім не рэагуе на гэта, а моўчкі запаўняе графы нескарыстоўваемых машын.

У **Полацкім** раёне ігнараванне радковай сяўбы стала панылым з'явішчам. У калгасах **«Новы шлях»** і **«Парыжская камуна»** сявяркі стаяць, сеюць толькі ўручную. Стаіць сявярка і ў саўгасе **Бездзелавічы.** У калгасе **«Усходы Леніна»** радковую сявярку «адрэгулівалі» так, што яна высявае па 5-6 пудоў на гектар.

У калгасе **імя Молатава** (Мазырчына) радковая сявярка не скарыстоўваецца. Праўленне, у якім сядзяць кулакі, выступае супроць механізацыі сельскай гаспадаркі.

Нарэшце, матэрыялы, якія мы друкуем сёння. Ці не з'яўляецца найвялікшым злачынствам перад партыяй і дзяржавай той факт, што ў калгасах **РЭЧЫЦКАЙ МТС** радковыя сявяркі скарыстоўваюцца толькі на 10 проц. У большасці калгасаў, абслугоўваемых гэтай МТС, сявяркі стаяць. У калгасах амаль няма людзей, знаёмых з машынай. Не ведаюць проста, як трэба адрэгуляваць сявярку. **Больш за ўсё віна тут падае на агратэхнічны персанал, які яшчэ знаходзіцца ў палоне коснасці і дзедаўскіх традыцый.**

Нельга прайсці міма і таго факта, што ў нас не мала агранамаў, якія самі не ведаюць, як трэба абыходзіцца з сявяркай, як трэба яе ўстанавіць.

Зараз, у часе сяўбы, класавыя ворагі зноў пускаюць у ход легенду аб «самабытнасці беларускай зямелькі, на якой машыны не пойдуць». А сярод раённых работнікаў знаходзіцца не мала класава-блізарукіх людзей, якія не бачаць гэтага манеўра класавага ворага, накіраванага на зрыў сяўбы, на зніжэнне ўраджайнасці.

Трэба да канца і бязлітасна разграміць антымеханізатарскія тэндэнцыі, трэба выкрыць ворагаў машыны.

Усе радковыя сявяркі вывезці на палі. Не марудзіць далей ні хвіліны. Даверыць машыны лепшым калгаснікам-ударнікам.

Арганізуем соцыялістычнае спаборніцтва на лепшае і максімальнае скарыстанне радковых сявярак! Кожную сявярку пад кантроль калгаснага актыва! Ні мінуты прастоя радковых сявярак!

МЕНСК. ЦК ПАРТЫІ ГІКАЛО

Працоўным Бірабіджана, заслухаўшы справаздачу піянерскай дэлегацыі, шлюць прывітанне ЦК комуністычнай партыі большэвікоў Беларусі. Брацкая дапамога Беларусі натхняе нас на далейшую барацьбу за будаўніцтва соцыялістычнага фарпоста на Далёкім Усходзе.

Няхай жыве ЦК КП(б)Б!

Няхай жыве цесная інтэрнацыянальная сувязь працоўных Беларусі і Бірабіджана!

ПРЭЗІДЫУМ.

Выканаем свой абавязак перад пролетарыямі Ленінграда

ДА 1-ГА КАСТРЫЧНІКА УСЯ БУЛЬБА ПАВІННА БЫЦЬ ЗВЕЗЕНА З ПОЛЯ

АРГАНІЗАВАЦЬ ПІЛЬНЫ НАГЛЯД ЗА ЯКАСЦЮ РАБОТ

Зацягваюць капанне да замаразкаў

ОРША. (Наш кар.). У аршанскім райза добра ведаюць, што капанне бульбы трэба было пачаць 15 верасня. Дырэктывы аб гэтым даны ўсім сельсоветам і калгасам.

А на справе? **Смальнянскі** сельсавет павінен здаць дзяржаве каля 730 тон. 48 вагонаў! Цэлы эшалон. Задача нялёгкая, выкананне яе патрабуе максімальнага напружання, выкарыстання ўсёй рабочай і цягавай сілы, своечасовага пачатка ўборкі. Між тым, у сельсавеце не спяшаюцца. Старшыня сельсавета **Кудзян**, сакратар ячэйкі **Кузьмінкоў** лічаць, што масавае капанне можна пачаць не раней 20-25 верасня. Такой-жа думкі прытрымліваюцца і ў Р. Сялецкім сельсавеце.

Чаму адкладваецца ўборка? Перш за ўсё таму, што калгаснікі не ведаюць аб дырэктывах партыі і ўрада па гэтым пытанні, што кіраўніцтва сельсоветаў і калгасаў ігнаруе дырэктывы аб тым, каб пачынаць уборку выбарачным парадкам, не чакаючы агульнага выспявання. Мы назіраем тут таксама тэндэнцыю чарговасці сельска-гаспадарчых работ.

— Калі пачнеш капаць бульбу?— пытаемся ў праўлення калгаса **«Большэвік»**, Р. Сялецкага сельсавета.

— А хто яго ведае, — адказваюць нам, — мабыць тады, калі скончым уборку аўса.

— А калі авёс убярыцё?

— Гэта ўжо як удасца: калі надвор'е дазволіць, тады і ўбяром.

У гэтым калгасе пануе кулацкая стаўка на зацяжку капання бульбы да замаразкаў.

Нам давялося праверыць ход уборкі ў шасці калгасах Смальнянскага і Р. Сялецкага сельсоветаў. Усюды выяўлен такі малюнак: нідзе няма графікаў работ па ўборцы, няма нават звычайных вытворчых заданняў брыгадзірам на гэты час. Зусім нічога не робіцца, каб падрыхтаваць памяшканні: лёгкія навесы і г. д. — для сушкі і пераборкі бульбы. У большай частцы калгасаў ігнаруецца ўказанне аб тым, каб за 5-7 дзён да пачатка капання бульбы вязаць бульбяшнік і скарыстаць яго для сіласавання. Толькі ў двух калгасах Смальнянскага сельсавета пачалі закладваць сіласныя ямы.

У некаторых калгасах наглядаюцца факты капання бульбы калгаснікамі для продажа яе на рынку, прычым ніхто не змагаецца з гэтым. У калгасе «Пролетарый», Р. Сялецкага сельсавета, старшыня **Каліноўскі** нават заахвочвае ўборку бульбы для продажа: «Можаце прадаваць, абы міліцыянер у ночы не траплёўся».

Раённыя арганізацыі павінны ўдарыць па такіх антыдзяржаўных, кулацкіх тэндэнцыях. Неабходна ліквідаваць самацёк у такой важнейшай рабоце як кошка бульбы і здача яе дзяржаве.

В. Д.

Да адказнасці—за сустрэчныя планы

ПОЛАЦАК. (Па тэлеграфу). У «Звязде» ад 16 верасня былі прыведзены факты дачы сустрэчных планаў па бульбе калгасу **«Чырвоны колас»**, Экіманскага сельсавета. У калгасе над бульбай засеяна 5 га (план выкананы поўнасцю); задание дана з разлікам 9 га.

18 верасня гэта справа разглядалася ў народным судзе. Факты пацвердзіліся. Сакратар Экіманскага сельсавета Ярашаў асуджан на год прымусовых работ.

ФРЫД.

РАЗГАРНУЛАСЯ МАСАВАЯ ЎБОРКА І ПАСТАЎКА БУЛЬБЫ

СЛУЦАК. (Па тэлефону). **У раёне пачалася масавая ўборка бульбы. Упарадзе ідзе калгас «ЧЫРВОНЫ БОР». Там калгаснікі з досвітам выходзяць на работу. Паміж брыгадамі заключаны дагаворы на соцспаборніцтва. Першая брыгада на чале з брыгадзірам ШУБАМ і другая, з брыгадзірам МІХНЕВІЧАМ, спаборнічаюць на лепшае правядзенне ўборкі і пастаўкі.**

Перадавыя сельсоветы раёна арганізавалі пастаўку бульбы проста з поля непасрэдна ў вагон. Другія суткі возіць бульбу на пункт калгас «ЧЫРВОНЫ СЦЯГ», Казловіцкага сельсавета. Ён арганізаваў праветрыванне бульбы ў гумнах, каб папярэдзіць псаванне прадукцыі.

Добра ідуць уборка і пастаўкі бульбы ў калгасе «НОВАЕ ЖЫЦЦЁ», Іванава-Гародніцкага сельсавета. Гэты калгас ужо здаў дзяржаве 40 тон. Пры кожнай брыгадзе арганізаваны бракеражныя камісіі, якія штодзенна правяраюць якасць уборкі.

Рад калгасаў раёна ўжо поўнасцю выканалі гадавы план паставак бульбы. КАЛГАС «ЧЫРВОНАЯ СТАЛІЦА» 17 ВЕРАСНЯ СКОНЧЫЎ ПАСТАЎКІ, ЗДАЎШЫ ДЗЯРЖАВЕ 100 ТОН ВЫСОКАЯКАСНАЙ БУЛЬБЫ.

Дрэнна здаецца прадукцыя ў лік натураплаты. Намеснік загадчыка слуцкай канторы Белплодагародніны развівае шкодную тэорыю, што «раней трэба здаваць бульбу ў лік паставак, а пасля ў лік натураплаты». 17 верасня калгас «Комінтэрн» прывёз бульбу ў лік натураплаты, але на прыёмачным пункце настойвалі на ўключэнні яе ў зводны паставак.

Трэба адзначыць перабой у падачы паражняка. 17 верасня было пагружана 11 вагонаў, столькі-ж 18-га, а на слуцкай базе яшчэ засталося непагружаных 10 вагонаў. Яшчэ горш стаіць справа з адгрузкай бульбы са старобінскай, чырвонаслабодскай і капыльскай баз Белплодагародніны, якія таксама дастаўляюць бульбу на ст. Слуцак. На гэтых базах сабралося некалькі дзесяткаў вагонаў бульбы. Патрэбны тэрміновыя меры, каб чыгунка без перабояў падавала належную колькасць вагонаў.

КАПЛАН.

***

ПУХАВІЧЫ. Не гледзячы на бліскучыя дакл. 17 верасня адгружана на Ленінграду з Пухавіцкага раёна 60 вагонаў бульбы двума эшалонамі.

ГАНТМАН.

Прыёмачныя пункты ў Бабруйску не падрыхтаваны

БАБРУЙСК. За прыёмку і адгрузку бульбы ў раёне адказвае райзаг. Для таго, каб адгрузіць 25.000 тон бульбы, трэба арганізаваць 6 прыёмачных пунктаў. Загадчык райзага тав. Плоткін і старшыня райспажыўсаюза тав. Тумаў запэўнілі, што ўсе шэсць пунктаў гатовы да прыёмкі. Гэта—яўная хлусня.

Зірнем на буйнейшы прыёмачны пункт на станцыі Цялуша, які павінен адгружаць 7 вагонаў штодзенна.

На пункце толькі адна вага, якая пры бесперапынным рабоце можа працаваць у гадзіну не больш 300 пудоў. Гэта значыць, што каля 2.000 пудоў бульбы будзе штодзенна заставацца ў запасе, будзе недагружана з-за недахвата вагі. Гэта азначае, што сотні здатчыкаў абавязаны будуць суткамі чакаць чаргі.

На Цялушскім пункце трэба мець 2-х прыёмшчыкаў у адну змену, а райзаг параніў на ўсе змены паставіць толькі 2-х работнікаў. Не падрыхтаваны таксама склады для ссыпання бульбы.

Калі зараз-жа не будуць прыняты экстраныя меры, на Цялушскім пункце не абмінуча стварацца «пробкі».

Цялушскі пункт—не выключэнне. Ён нават,—па словах тав. Плоткіна,—адзін з лепшых у раёне. Возьмем пункт Ясень. Там няма паловы патрэбных работнікаў, а ў Баровічах зусім не пабудаваны памяшканні для ссыпкі бульбы.

З шасці пунктаў два—Кочэрыцкі і Баровічкі—знаходзяцца ў глыбінцы. Яны павінны прыняць 28,5 проц. усяго раённага плана. Іх задача—дастаўляць бульбу за 30 клм. у Бабруйск. Для таго, каб наладзіць бесперапынную і своечасовую дастаўку, трэба кожны дзень пасылаць не менш 400 фурманак.

Райзаг аб гэтым нават і не думае. Тав. Плоткін запэўнае, што па гэтай частцы ніякай небяспекі няма; будзем перавозіць аўтамабілямі. У райзага ёсць толькі адна машына. Ён спадзяецца на Саюзтрансе, які дапаможа, ды Ленінград абяцаў даць свой аўтаатрад. Атнім словам, усё пабудавана на хісткім фундаменце надзей і абяцанняў, і нічога канкрэтнага. Ніякіх дагавораў з Саюзтрансам і не ніцраладскімі арганізацыямі не заключана.

Як правіла, на кожным пункце павінна быць бульбасартоўка. Райзаг лічыць гэта «лішняй» работай. Таму толькі на трох буйных пунктах устаноўлена па адной бульбасартоўцы. Між тым, па бабруйскім пункце можна штодзенна бачыць чаргі здатчыкаў, якія чакаюць, пакуль аслабяніца бульбасартоўка. Адна машына ніяк не можа абслужыць усіх жадаючых сартаваць бульбу.

Што гэта, як не ігнараванне барацьбы за высокую якасць бульбы?

П. АРЦЕЛЬНЫ.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

Чыстку КП(б)Б узняць на яшчэ больш высокую ступень

(Даклад члена рэспубліканскай камісіі па чыстцы тав. САХАРАВАЙ на сходзе менскага партактыва)

Некаторыя папярэднія вынікі

Чыстка партыі зараз шырока разгарнулася. Спачатку мы праводзілі чыстку гарадскіх ячэек і часткова вясковых. Зараз чыстка ідзе разгорнута і ў горадзе і ў вёсцы. Прыступаем да чысткі партарганізацый Чырвонай арміі, наркаматаў і ВПУ.

Поўнасцю завершана чыстка ў 15-ці раёнах. Зараз чысткай ахоплена 38 раёнаў, у 22-х раёнах чыстка яшчэ не пачалася. Трэба моць на ўвазе, што паводле плана нам трэба закончыць чыстку грамадзянскіх ячэек да 1 лістапада. Як бачыце, тэрмін у нас невялікі. Але гэта не значыць, што мы будзем фарсаваць тэмпы чысткі за кошт якасці. Ні ў якім выпадку.

Тэрміны чысткі напружаныя. Яны вымагаюць асаблівай увагі і асаблівага разварота работы ячэек у дапамогу камісіям. Ячэйкі павінны дабіцца таго, каб была разгорнута такая самакрытыка, жаха дапамагла б праверачным камісіям выявіць усе недахопы ў часе чысткі і своечасова іх выправіць.

Рэспубліканская камісія яшчэ не заслухала выпадаў па тых 15-ці раёнах, дзе чыстка ўжо закончылася. Але ўжо зараз можна сказаць, што па раду раёнаў работа была праароблена не дрэнна. Возмем барысаўскую арганізацыю. У працэсе чысткі рэспубліканская камісія своечасова выправіла ряд недахопаў, якія былі вылучены. Трэба сказаць, што барысаўская арганізацыя ў сваёй масе здаровая, актыўна падыйшла і зразумеў сваю задачу як у галіне гаспадарчай, так і палітычнай работы.

Да раённых камісій, добра правёўшых сваю работу, трэба аднесці і дрыгінскую. У часе чысткі выявілася абсалютная пяздольнасць раённага кіраўніцтва кіраваць як гаспадарчай, так і палітычнай работай. ЦК КП(б)Б у працэсе чысткі гэта кіраўніцтва зняў, многія з кіруючых работнікаў выключаны з партыі. Патрэбна прайшла чыстка ў Старобінскім раёне. Праверачная камісія зробела там паставіць рад прынцыповых пытанняў, на якія раённая арганізацыя сама не змагла хутка і своечасова рэагаваць.

Значна слабей прайшла ў нас чыстка ў Талачыне. Праверачная камісія ў пачатку і ў ходзе самой чысткі працавала павярхоўна, ускрывала недахопы, але пад канец яна не змагла даць палітычнай ацэнкі ўскрытым недахопам, не змагла паставіць рад пытанняў, над якімі раённаму камітэту трэба ў далейшым працаваць. Мы гэты раён заслухалі на бюро ЦК. Было прызнана, што работа ў Талачыне праводзена не зусім здавальняюча.

Вы бачыце, якую велізарную адказнасць павінны несці праверачныя камісіі. Праверачным камісіям павінны ў працэсе чысткі ўзняць партарганізацыі на вышэйшую ступень. Яны павінны і абавязаны ўскрываць усё гнілое, што трэба выкінуць, выпраўляць памылкі, даць палітычную ацэнку, зрабіць вывады, указаць над чым раён павінен працаваць, змагчы выявіць актыў і дапамагчы яго расставіць на патрабавалі высокай якасці працуючый, а зараз, калі тэвараправодзячая сетка патрабавала якасці пашыўкі, швейнікі знайшлі выхад. Зараз яны ўжо не псуюць матэрыяла.

Партыя і ўрад паставілі пытанне проста, што за дрэнную работу трэба аддаваць пад суд. У Ленінградзе быў ужо працэс па швейнай і шкляной фабрыках. Трэба паставіць пытанне аб барацьбе з бракам з усёй рашучасцю.

Возьмем віцебскую арганізацыю. Да гэтага часу Віцебск амаль ніколі не выконваў прамфінплана. Зараз Віцебск па выкананні прамфінплана стаіць на першым месцы ў рэспубліцы. Праўда, ЦК КП(б)Б шмат зрабіў для таго, каб умацаваць віцебскую арганізацыю, каб больш не было таго, што было да новага кіраўніцтва. Але разам з тым вельмі многа зрабілі ячэйковыя праверачныя камісіі, якія зробілі на канкрэтных прыкладах указаць недахопы ў рабоце пасобных фабрык, зробілі па канкрэтных гаспадарча-палітычных пытаннях мабілізаваць масы, узняць іх актыўнасць. Перад віцебскай арганізацыяй была паставлена задача—вывесці прамысловасць з прарыва. І трэба сказаць, што арганізацыя не дрэнна, па-большэвіцку справляецца з гэтай задачай.

Фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі» да чысткі выконвала план на 90 проц., у часе чысткі—на 118 проц. Член партыі Баброў, які працуе на фанерным заводзе, да чысткі выконваў план у размерах 89 проц., у часе чысткі — на 111 проц. Значыцца працаваць можна, але для гэтага трэба, каб усякі часна, добрасумленна выконваў тую работу, якую даручылі яму партыя і ўрад, каб кожны адчуваў, што ён з'яўляецца большэвікам і нясе адказнасць за той участак работы, які яму даручан. Мы ба чым, таварышы, што чыстка дала вельмі і вельмі вялікія зрухі ў галіне партыйнай і прапоўнай дысцыпліны, у галіне выканання прамфінплана віць на рашаючых участках.

Усяго ў нас прачышчана па Беларусі 23.378 чалавек. З іх членаў партыі — 15.955, кандыдатаў—7.023. Выключана 4.025 чалавек — 17,2 проц. З гэтай колькасці праверанных выключана членаў партыі 2.412 чалавек, або 15 проц. і кандыдатаў 1.613 чалавек—21 проц. Пераведзена з гэтай-жа колькасці з членаў у кандыдаты партыі 1.875 чалавек—11,8 проц. З членаў партыі ў спачуваючыя (ёсць выпадкі, калі члены партыі пераводзіліся ў спачуваючыя)—187 чалавек, 1,2 проц. Пераведзена з кандыдатаў у спачуваючыя 1.517 чалавек, або 20,4 проц.

Каго выключаюць? У скончаўшых чыстку 9-ці раёнаў выключана: класава-чужых элементаў—13 проц., двурушнікаў 7 проц., парушальнікаў дысцыпліны партыі і дзяржаўнай дысцыпліны—13 проц., заціскальнікаў самакрытыкі, парушальнікаў унутрыпартыйнай дэмакратыі—1,5 проц., за пасіўнае знаходжанне ў партыі—15 проц., перараджэнцаў і зрошчваючыхся з буржуазнымі элементамі — 26 проц., кар'арыстаў, шкурнікаў, бюракратаў, скарыстоўваючых сваё службовае становішча ў карысных метах—5 проц.

13 проц. вычышчаных, як класава-чужыя элементы, гаворыць за тое, што прымалі ў партыю без дэтальнай праверкі людзей. У пагоні за колькасцю ўпускалі якасць. Гэтым карысталіся класава-чужыя элементы, пралазячы ў партыю. Гэтым, між іншым, тлумачыцца і вялікі параўнаўча процант—15 проц. выключэння за пасіўнасць.

Процант выключаных перараджэнцаў і зрошчыхся з буржуазным элементам складае 26. Гэта вельмі многа. Аб чым гэта гаворыць? Гэта гаворыць аб тым, што класава-варожыя элементы ўцлываюць на найбольш нястойлівых членаў партыі, што не было большэвіцкага выхавання.

Каго мы выключаем? Возьмем, напрыклад, ячэйкі чыгункі. Там у нас сустракаліся такія тыпы, якія былі ў белагвардзейскай арміі, былі ў Калчака і ў Дзянікіна. На чыстцы выявілася, што такія элементы зробілі пралезці ў партыю і нават на адказныя работы, застаючыся зусім чужымі нам людзьмі.

Трэба яшчэ сказаць, што не было выстарчальнай пільнасці з боку ячэек. Гэта асабліва адносіцца да ячэек совгасаў. Было шмат выпадкаў, у прыватнасці ў Заслаўскім раёне, калі прыходзілі ў совгас асобы, выдаваўшыя сябе за рабочых, гаварылі, што яны партыйцы, хоць не прыносілі ўчотных картак, іх залічалі на работу. У совгасах такія элементы робяць свае шкодніцкія спрагы.

Таму пытанне аб пільнасці, пытанне аб тым, каго прымаць у партыю, гэта—цэнтральнае пытанне. Возьмем, напрыклад, Паўночны Каўказ. Там пралезлі ў партыю контр-рэвалюцыйныя элементы, белыя афіцэры. Трэба сказаць, што гэта мае месца і ў Беларусі.

Чыстка ўзнімае актыўнасць і баяздольнасць партыйных арганізацый

Трэба сказаць, што чыстка зрабіла велізарны зрух як у гаспадарчай, так і ў палітычнай рабоце. Рабочыя і калгасныя масы сустрэлі чыстку з вялікім энтузіязмам.

У нас ёсць такія даныя па Менску. На мясакамбінату да чысткі брак дасягаў 12-16 проц., а ў часе чысткі брак амаль ліквідаван. На Асінторфе да чысткі не было ні аднаго ўдарніка, у часе чысткі — 374 чал. абвясцілі сябе ўдарнікамі. Увогуле, усе рабочыя, якія знаходзяцца на торфбалотах, абвясцілі сябе ўдарнікамі, узялі на сябе канкрэтныя абавязацельствы. У перыад чысткі добра сябе паказалі комсамольцы. Яны ўзялі многіх тарфінікаў на буксір, выклікалі іх па соцспаборніцтва. Да чысткі брыгада Шубры вырабляла 33 тыс. паглін, а ў часе чысткі дагнала выпрацоўку да 45 тыс. і выклікала па соцспаборніцтва іншыя брыгады. Комсамольская брыгада ў часе чысткі выконвала прамфінплан на 147 проц., абвясціла двухтыднёвы штурм і замацавалася да канца сезона. Інжынер-тэхнічны персанал Асінторфа абвясціў сябе ўдарнікам.

Вольні характэрны факт па Гомелі. Швейная фабрыка «Комінтэрн» увесь час давала вялікі брак па цэху бялізны. У часе чысткі паставілі перад ім пытанне: або працаваць як трэба, або зусім не працаваць. Або яны дакажуць, што з'яўляюцца большэвікамі, або пытанне будзе паставлена так, што яны не маюць права на гэта гаварове званне. Таварышы знайшлі выхад. Яны адпукалі некаторыя прыстасаванні і пачалі сапраўды лепш працаваць. Калі я прыйшла да іх і спыталася ці можна лепш працаваць, яны адказалі: «Так, можна лепш працаваць». І вось, аказваецца, яны знайшлі такія лапкі, якія замыкаюць швы. Раней, бывала, калі вывернеш кашулю, на левым баку аказваліся адны лахмоцці, а зараз швы добра замываюцца. Трэба сказаць, што гэтыя лапкі былі пры кожнай машыне з даўнага часу але вось капіталістычныя арганізацыі

Узброіць кожнага члена партыі рэвалюцыйнай тэорыяй

У галіне ідэалагічнага выхавання ў нас таксама ёсць вялікія зрухі. Возьмем барысаўскую арганізацыю. Зімой тут было ахоплена вучобай 1.417 чалавек, а цяпер, у часе чысткі, нават у летні час, займаліся ў гуртках 1.595 чалавек, што складае 95 проц. усёй арганізацыі. Апрача таго, было ахоплена вучобай 752 беспартыйных. І так, мы бачым, што тут ёсць вельмі і вельмі вялікі ўзрыў. Возьмем зноў Віцебск. У Віцебску цяпер працуюць палітасветгурткі, дзе праводзяцца спецыяльна запіткі з тымі, якія ў часе чысткі былі пераведзены ў кандыдаты з членаў партыі. Амаль няма выпадкаў, каб пераведзеныя ў кандыдаты не прыходзілі на партыйныя запіткі. Значна павысіўся палітычны ўзровень рабочых—членаў партыі і іх патрэбнасць у літаратуры. Возьмем менскі завод імя Варашылава. Мне там давялося быць асабіста. Рабочыя на чыстцы паказалі, што яны палітычна падрыхтаваны і падрыхтаваны даволі ядрэнна, разбіраюцца і могуць весці за сабой масы.

Але гэты ўчастак з'яўляецца яшчэ адстаючым. У Суражскай арганізацыі, якая пядаўна правяралася, 35 членаў зусім не выпісваюць ніякіх газет і 5 проц. чытаюць газеты нерэгулярна. Калі ўзяць такую ячэйку, як лесазавода «Ноўкі», то з 20 членаў калектыва 15 не выпісваюць газет, а пяць выпісваюць, але рэгулярна не чытаюць.

Ва ўсіх раёнах мы маем велізарную колькасць членаў партыі і кандыдатаў, якія не ў стане адказаць на элементарныя пытанні. Таму партыйная вучоба, тэарытычная падрыхтоўка павінна быць шырока разгорнута ў гарадскіх ячэйках і на вёсцы, павінна зьяўляцца адной з асноўных задач у рабоце партыйных арганізацый.

У галіне вучобы многае залежыць ад таго, хто выкладае і як выкладае. Раённыя камітэты партыі павінны па гэты ўчастак работы пасадзіць такіх людзей, якія адказвалі-б за выкананне партыйных задач, што перад імі ставіцца, а ў нас часамі на гэтых участ

ках сядзяць людзі абсалютна чужыя.

Вось вам некалькі прыкладаў. У Чэрвеньскім раёне пейкі Кат аказаўся загадчыкам культпропа. Ён былы афіцэр арміі Керэнскага, да 1918 года быў камандзірам роты. У 1918 годзе ён прыехаў у Чэрвеньскі раён. У яго была гаспадарка, меў сувязь з белагвардзейцамі. Будучы ў партыі ён спекуляваў валютай. У 1927 г. ён узбудзіў справу супроць аднаго грамадзяніна, які ўкраў у яго паўтары тысячы рублёў золата. Вось каму даверылі выхаванне членаў партыі.

Другі прыклад. Тарасін—былы кулак, нічога агульнага не мае з партыяй, прымаў актыўны ўдзел у барацьбе супроць совецкай улады, а да чысткі ведаў партбілетам. Можна было-б прывесці яшчэ шмат аналагічных фактаў, якія былі выяўлены ў часе чысткі. Зразумела, у нас становішча зусім не такое, што ўсюды па ўчастках культурна-палітычнай работы сядзяць варожыя людзі. Але трэба сказаць, што яшчэ шмат чужых для нас людзей сядзяць на гэтым участку. Адсюль вывад—патрэбна асабліва пільнасць да тых людзей, якія сядзяць на прапагандысцкай работе.

У Віцебску мне прыйшлося па апеляцыі разглядаць справу Брома. Ён, з'яўляючыся дырэктарам рабфака, распрацоўваў праграмы, наогул кіраваў палітасветработай. А хто такі гэты Бром? Ён сын гандляра і зараз жыве з гэтым-жа гандляром. Яго ўсе ведаюць, як сына гандляра, а ён «прасвячае» беспартыйных, кандыдатаў, членаў партыі, комсамол і г. д. У мянчанскіх колах яго, як свайго чалавека, так і называюць: «Наш Яшка». Цэнтральны Камітэт партыі і ЦКК прад'яўляюць патрабаванні да членаў і кандыдатаў партыі—авладаць пэўным мінімумам палітычных і тэарытычных ведаў. Раённыя камітэты партыі павінны гэта ўлічыць і, не чакаючы скончэння чысткі, паглядзець, хто сядзіць на прапагандысцкай рабоце.

Трэба пашырыць сетку гурткоў, бо ў нас яшчэ вялікая палітычная неісмеменнасць. Т. т. Ленін і Сталін вучылі, што без рэвалюцыйнай тэорыі не можа быць рэвалюцыйнага руху. Зараз, калі мы кіруем такой вялізарнай дзяржавай, як Совецкі саюз, пытанне аб авладанні рэвалюцыйнай тэорыяй набывае асабліва значэнне.

Мы-б не дабіліся такіх вялікіх перамог без рэвалюцыйнай тэорыі. «Тэорыя,—гаворыць т. Сталін,—можа ператварыцца ў вялізарнейшую сілу рабочага руху, калі яна складваецца ў непарыўнай сувязі з рэвалюцыйнай практыкай, бо яна і толькі яна можа даць руху ўпэўненасць, сілу арыентавання і разумення ўнутранай сувязі акружаючых падзей, бо яна і толькі яна можа дапамагчы практыку зразумець не толькі тое, як і куды рухаюцца класы ў цяперашнім, але і тое, як і куды павінны рушыцца яны ў бліжэйшым будучым».

Рэвалюцыйная тэорыя для нас, большэвікоў, з'яўляецца светачам, які асвятляе шлях не толькі нам у Совецкім саюзе, будуючым соцыялізм, але працоўным усяго свету, якія змагаюцца за звяржэнне буржуазнага ладу і ўстанаўленне дыктатуры пролетарыята.

Больш рэвалюцыйнай пільнасці

У нас былі факты, калі члены партыі ўтойвалі злоўжыванні. Напрыклад, у Бабруйску арганізавалі змову супроць чысткі—не выдаваць нікога, нічога ні аб кім не гаварыць. Але, таварышы, утаіць ад чысткі вельмі цяжка. Чыстка зараз так усклыхнула масы, што калі асобныя члены партыі маўчаць, то ўскрываюць бяспачыствы ўся партыйная маса, а таксама і беспартыйныя.

У Горацкім раёне быў такі факт. У Белбудзе было яўнае шкодніцтва. Будаўніцтва далоў вядзецца такім чынам, каб яны працаторы час разваліліся. Каб утаіць гэта ад камісіі па чыстцы, сакратар ячэйкі даў «установку»: нікому ні аб кім не гаварыць. Збіраліся падпольна, выпрацоўвалі план, як сябе трымаць. Угаворвалі многіх беспартыйных, каб яны пашлі на гэту здзелку. Але камісія па чыстцы пры актыўнай падтрымцы партыйных і беспартыйных мас выкрыла ўсё гэта.

Ёсць шмат фактаў кругавой парукі. У Гомелі мне прышлося быць пры чыстцы аднаго члена партыі, які быў гаспадарыкам і меў наёмную рабочую сілу. З 1913 па 1918 год ён меў майстэрні. Потым, па 52 годзе свайго жыцця—у 1930 годзе ўступае ў партыю. Я ў яго пытаю: «Што вас штурхнула ўступіць у партыю?» Ён адказаў: «Усе ў партыі і я—у партыю». Ён паведаміў мне, што з'яўляецца «лепшым» ударнікам, што ён—герой другой пяцігодкі. У яго абарону выступіў рабочы, член партыі, які ў яго раней працаваў. «Я хоць у яго працаваў, калі ён быў гаспадаром, але ён не кепска абыходзіўся. Калі ён атрымліваў за год 5 руб., то мне плаціў 3 р. 50 кап.». Гэта заява паказвае, што ў гэтага «комуніста» няма нават класавай самасвядомасці. Аказалася, што гэты-ж рабочы рэкамэндаваў свайго былога гаспадара ў партыю.

Характэрныя факты самейнасці выявіліся ў працэсе чысткі на менскім мясакамбінаце. У кішэчным цэху з 22 рабочых 11 рабочых былі сваякамі начальніка цэха Каца. 4 рабочых—сваякі інструктара майстра Кадоліса. А Кац—у нелаўскім мінулым гандляр, на камбінаце працэс у партыю. Жонка Каца—дачка кулака. На грошы цесця ён пабудаваў у Менску дом, а потым дапамагаў цесцю ракулачыцца: браў заводскага каня і вывозіў маемасць цесця. Дырэктар камбіната—былы трацкіст, брат гэтага самага Каца. Вось у якіх руках знаходзіўся камбінат. Адсюль і злоўжыванні, і раскрадванні, і кругавая парука. Адсюль—невыкананне прамфінплана.

Ачысціцца ад буржуазна-нацыяналістычных элементаў

Нашы партыйныя арганізацыі і камісіі па чыстцы павінны ўзняць вялікую работу па ачышчэнню радоў нашай партыі ад буржуазна-нацыяналістычных элементаў, па інтэрнацыянальным выхаванні шырокіх працоўных мас. Гэта, вядома, не па духу вялікадзяржаўнікам, контр-рэвалюцыйным нацдэмам і бундаўцам, якія яшчэ не разброіліся.

Да нас паступаюць лісты і запіскі, што мы нібы арганізавалі танешне па былых бундаўцаў і пагоул на выхадцаў з іншых партый. На гэта мы павінны проста сказаць, што гэта—яўная хлусня. Усе тыя выхадцы з іншых партый, якія працуюць добрасумленна змагаюцца за генеральную лінію партыі, застаюцца ў партыі, а тыя, якія не могуць і не хочуць вызваліцца ад старога груза, змагаюцца супроць генеральнай лініі партыі, тых мы выкідваем.

Чыстка выявіла, што з-за страты класавай пільнасці ў асобных звенях партыйных і совецкіх арганізацый нацдэмаўскія элементы тварылі свае подлыя справы, дзейнічаючы ціхай сапай. Нацдэм не скажа: «Я нацдэм—прасачыце за мной». Наадварот, ён стараецца прыкрыцца.

Яркі тып нацдэма выяўлен у магілеўскай арганізацыі. Гэта—Капаевіч, былы дырэктар педінстытута. Ён выпусціў шмат літаратуры, якая ішла ў сярэдніх і нізэйшых школы. У гэтай літаратуры, што называецца, самым непрыкрытым чынам ён усяляў не калгасы, а хутары. Да таго-ж ён з'яўляецца сапраўдным пагромшчыкам. Калі ён у сваёй літаратуры апісвае яўрэйскі пагром, адчуваеш, які пагромшчык сам Капаевіч. Ён апісвае пагром мовай махровага чорнасоценца.

Гэты Капаевіч у райкоме лічыўся самым лепшым актывістам. Яму даручалі адказныя справы. Але чыстка выявіла сапраўдны твар Капаевіча, выкрыла яго. Ён выключан з партыі.

У нас яшчэ ёсць асобныя факты праяўлення нацдэмаўшчыны і ва ўстановах і ў некаторых плануючых арганізацыях. Таму тут патрэбна асабліва большэвіцкая пільнасць. Трэба ўзмацніць агонь на вялікадзяржаўнаму шавінізму—галоўнай небяспецы, па мясцоваму нацыяналізму ўсіх мастей. Яшчэ больш разгарнуць работу па інтэрнацыянальнаму выхаванню рабочых і калгасных мас.

Чыстка совецкіх ячэек—адказная справа

Гэтымі днямі мы пачалі чысьціць совецкія ячэйкі і, галоўным чынам, наркаматаўскія ячэйкі. Чыстка наркаматаўскіх ячэек—адказная справа. На-першае, наркамат акрэслівае палітыку па раду гаспадарчых пытанняў. Трэба сказаць, што нашы наркаматы, вядома, не ўсе, за апошні час падцягнуліся. Мінулая вясна і лета гэта даказалі. Тут, зразумела, вялікую ролю адыграла ўзмацненне партыйнага кіраўніцтва наркаматамі. Але трэба сказаць, што ва многіх наркаматах работа ідзе яшчэ дрэнна, не па-большэвіцку.

Возьмем пытанне аб бюракратызме. Трэба адзнатыць, што па Наркамзему выяўлена 1.800 скаргаў, якія марынуюцца на працягу 16 месяцаў і больш. У інспектара Наркамзема Рахманава выяўлена 50 скаргаў, якія ўвесь час ляжаць без руху. Асобныя работнікі, якія павінны гэтыя скаргі, разглядаць, напрыклад, т. Пражог, адказвае калгаснику, які да яго прыехаў: «Ты паяжджай, а мы разгледзім».

Або возьмем прыёмную ЦВК. Калгаснікамі была падана заява аб тым, што ў іх няма бульбы на насенне. Ім своечасова трэба было адразу сказаць, дзе ўзяць гэту бульбу, але зрабілі не так. Гэта заява ляжала да ліпеня, а потым не паслалі гомельскаму гарсавету з такой прыпіскай: «Прыёмная ЦВК пры гэтым пакіроўвае заяву Зайцава і інш аб дапамозе насеннай бульбай. якой у іх няма, для вашага вырашэння на месцы. За гадзяк прыёмнай (подпіс)». Пакуль пачалі «вырашаць», сяўба дайно прайшла, бульбу трэба было не сеяць, а ўжо капаць (смех). Гэта абурэючы факт бюракратызма.

ЦВК кіруе шэлкай работай, але асобныя работнікі апарата, якія паставлены на той ці іншы участак, не хочуць выконваць сваю работу як указвае партыя і ўрад. І таму ў часе чысткі трэба будзе так паставіць справу, каб усе работнікі, а ў першую чаргу комуністы, патрабаванні партыі і ўрада дакладна выконвалі.

Нашы наркаматы, усе нашы ўстановы павінны быць прыстасаваны для абслугоўвання найшырэйшых мас насельніцтва. Гэтага заўсёды патрабаваў Ленін. Таму за бюракратызм, за неганіну трэба ўдарыць і ўдарыць моцна.

Тав. Ленін у самыя напружаныя гады грамадзянскай вайны, калі рэвалюцыі пагражала небяспека, умеў прымаць сялян, знаходзіў час з імі гутарыць, ведаў іх настроі і чаўт сам правяраў, што робіцца з заявамі таго ці іншага паведамлення. Нядаўна мне прышлося гутарыць з адным таварышом, працаваўшым сакратаром Уладзіміра Ільіча. Ён мне паказаў цэлы рад запісак (яны пераданы ў музей), у якіх т. Ленін змяў пытаў, што кожны дзень пытаў, што зроблена па той ці іншай заяве і прас'ю чыю асабіста дакладваць. Вось як В. І. Ленін рэагаваў на скаргі. Калі Уладзімір Ільіч быў хворы, ён атрымаў ліст ад чырвонаармейца Семяннікава. Чырвонаармеец Семяннікаў абвінавачваў ільіча праўды, піша Уладзіміру Ільічу, што ён чакае ажала тры дні і пакончыць самагубствам, калі адказа не атрымае. Не глядзячы на тое, што Уладзімір Ільіч быў цяжка хворы, ён адразу-жа рэагаваў, прычым рэагаваў зусім незвычайным чынам, паказваючы, як трэба рэагаваць на скаргі прапоўных. Вось адказ Уладзіміра Ільіча на гэты ліст, адрасаваны Фелікаў:

«13-VII-1921 г.

1) Адпукайце аўтара тэрмінова. Прыгоніце, супакойце, скажыце, што я хворы, але справу яго рушу.

2) Ліст яго дайце перадрукаваць на машынцы ў некалькіх экземплярах.

1 Молатаву

1 Сольцу ЦКК.

3) Пры пасылцы ліста Молатаву дайце ад мяне: прапаную паслаць кантрольную камісію на Дон з членаў УсеЦВК і 10 (або 20) свярлоўнаў (аўтара ўзяць з сабой) і растраляць на месцы тых, каго выкрыюць у грабажах.

Ленін».

А ў нас часта людзі не адчуваюць, што яны работнікі пролетарскай дзяржавы. У іх трэба будзе па чыстцы аб усім запытаць.

Возьмем Камунгас. Там замест таго, каб па сапраўднаму планаваць, выходзяць з таго, якія непаступленныя і дрэнтарадныя будуўлі, звялі справу да таго, што з сумы па будаўніцтва ў 4 з палавай мільёны рублёў разнесцілі каму адну тысячу, каму дзве. Так і «спланавалі». Недапушчальна так працаваць. Апарат Камунгаса паогул расхлабаны, на работу своечасова не прыходзяць. Штат запоўнен, а работы сапраўднай няма.

Паглядзеце ваколіцы Менску. Там вы ўбачыце рад разварочаных ям. Многія гавораць, што гэтыя ямы ўжо ў такім стане знаходзяцца па два гады. Усё падбіраюць, прымяраюць і ніяк не могуць падабраць труб. Недапушчальная работа.

За найстражэйшую фінансавую дысцыпліну

Не раз партыя ставіла пытанне аб фінансавай дысцыпліне. Скарачаліся штаты наркаматаў для таго, каб патаніць наш совецкі апарат, каб марна не выдаткоўваць грошы. Але што мы цяпер бачым? Пачну з Менскага гарсавета. Там перарасход па бюджэту 1933 года складае 29.739 руб.

Па апарату Наркамасветы перарасход па бюджэту складае 10.293 руб. вышай зацверджанай сумы. Лесбел—19.770 руб. Па апарату сувязі перарасход 8 проц. бюджэта.

У Наркамасветы ў мінулым годзе за пяць месяцаў было выдаткавана на тэлеграмы 1.747 руб., у 1933 г.—5.176 р. На камандыроўкі асігнавана ў 1933 г. 4.300 руб., а выдаткавана 22.195 руб. Па Лесбелу па камандыроўкі замест устаноўленых 34 тыс. руб. ужо выдаткавана сума ў 41.700 руб.

На які наркамат і апарат мы не паглядзелі-б, усюды парушэнне фінансавай дысцыпліны. Таму ў часе чысткі трэба будзе паглядзець, куды едуць, чаго едуць, што гэтыя камандыроўкі даюць, як камандыраваныя на месцы праводзяць работу. Ёсць яшчэ шмат работнікаў, якія лічаць, што, бачыце, грошы не са свайёй кішэні, а таму шкадаваць іх няма чаго. Вось за такія, як называе іх там. Сталін, свінскія адносіны да дзяржаўных сродкаў, праяўляюцца не толькі радавымі служачымі, але і кіраўнікамі, трэба моцна біць і па лініі партыйнай, і па лініі дзяржаўнай.

Мы павінны цвёрда паставіць пытанне аб фінансавай дысцыпліне. Раз бюджэт зацверджан, не выходзь з яго. А калі патрэбна, то ў кожным асобным выпадку трэба ставіць пытанне перад тымі ўстановамі, якія гэта пытанне могуць вырашыць.

За цвёрды парадак у совецкіх установах

Я папрасіла нашу «лёгкую кавалерыю» паглядзець, якое становішча ва ўстановах, як прыходзяць на работу. Малюнак адрымаўся дрэнны.

Праверылі Наркамзем—спазнілася 37 чалавек, у Маслапрамсаюзе — 18 чалавек, у ДВБ — 22 чал., у Наркамасветы—23 чал., у Ільнатрактарцэнтры—18 чал., у гарсавеце—10 чал. Адсюль брыгада вышла ў 10 гадзін, а 11-ці чалавек яшчэ не было. У Галоўдартрансе спазнілася 36 чалавек, а 14 чал. да часу адыхода брыгады яшчэ не прышло. У прафсаюзных арганізацыях налічылі 96 спазненняў. Характэрна, калі нашы «кавалерысты» запыталі ў прафсаюзах аб спазненнях, ім адказалі, што «гэта ў нас заўсёды так бывае». У Белкаапсаюзе спазніўшыхся налічылі 39 чалавек.

Комсамольцы падлічылі, што па спазненнях апарат страціў 243 гадзіны, 23 працадні. Потым нам комсамольцы расказалі вось яшчэ якую роч. Калі яны былі ў гарсавеце і сакратар т. Яцэвіч спазніўся на 35 мінут, ён адмовіўся назваць сваё прозвішча і пачаў грубіць. Недапушчальная роч. Побач з гэтым комсамольцы выявілі, што ўсе паперы ляжаць па сталам—сакрэтныя і несакрэтныя.

Трэба ставіць пытанне проста—калі пенсію адрымліваеш, то прыходзь своечасова на работу. На заводах пытанне паставлена так—калі своечасова не прыходзіш на работу, прагульваеш без уважлівых прычын, лыж ужыгаюцца спачатку аж да звальнення. Тое самае трэба зрабіць і ва ўстановах. Кіраўнікі ўстаноў павінны правяраць, чым кожны работнік займаецца, чым ён запаўняе свой рабочы дзень, ці не паскрывае ён так сабе паром без толку. **Праверка выканання—вось што трэба паставіць у цэнтры ўвагі совецкага апарата.**

Сёння мы склікалі совецкія ячэйкі для таго, каб яны ў сябе паглядзелі, як у іх стаіць справа, каб яны па-большэвіцку разгарнулі самакрытыку, ускрылі свае недахопы.

Рабочае шэфства ператварыць у моцны вагар паляпшэння работы совапарата

Многія наркаматы маюць шэфаў, але шэфства праходзіць, так сказаць, урачыста, фармальна. Збіраюцца, пахлопаюць адзін другога, пайграе музыка і па гэтым справа канчаецца. Такое шэфства пікуды не варта. Хіба шэф не адказвае за тое, што тысячы скаргаў ляжаць неразабранымі, што ёсць вялікія звышкаштарысныя перарасходы, што няма своечасовага выхада на работу, няма прапоўнай дысцыпліны? Зразумела, шэфы павінны адказваць, бо шэфства ў нас павінна быць не па форме, а па сутнасці. Рабочыя ячэйкі павінны, могуць і абавязаны арабочыць апараты з тым, каб яны ўстанавілі там рабочы кантроль. Таму ў часе чысткі ўсе гэтыя шэфскія арганізацыі і далегацыі ад рабочых, звязаныя з наркаматам, павінны бываць у часе чысткі ў наркаматах для таго, каб сапраўды як след развіць самакрытыку, для таго, каб па-сапраўднаму дапамагчы камісіям на чыстцы.

Якасць асвятлення чысткі ў друку павінна быць палепшана

Друк наш, трэба проста сказаць, не зусім здавальняюча працуе. Калі ўзяць раённы друк, ён вельмі мала адлюстроўвае тое, што выяўляецца ў часе чысткі. У часе чысткі выяўляецца вялізарны творчы рост і ўздым энтузіязма шырокіх калгасных мас, а ў друку гэтыя працэсы не адлюстроўваюцца.

Друку трэба падхапіць і паказаць энтузіязм мас, паказаць тыя зрухі, якія ёсць і ў выкананні прамфінплана і па марксіцка-ленінскаму выхаванню, і ў рабоце з кандыдатамі.

Мы пядаўна патрабавалі прыцягнуць літаратурныя сілы да гэтай справы. Паехаў таварыш на завод імя Ланцуцкага. Апісаў завод не дрэнна, але тварны, жывыя людзі ў гэтым заводзе выпалі з апавяданьня. Ён моцна апісаў завод, што ён рабіў і што робіць. Але галоўныя фігуры-ударнікі не былі яркі паказаны. Друк павінен мабілізаваць пісьменнікаў, якія маглі-б у мастацкай форме паказаць калгасы, іх пераважні перад адпасобнай гаспадаркай, перад хутарской, паказаць перспектывы новага калгаснага ладу.

Друку Беларусі трэба вучыцца ў «Праўды», як паставіць работу. Шматтыражкам, калгасным газетам, раённым газетам трэба паставіць работу так, каб яны сапраўды адказвалі за тыя задачы, якія на іх ускладзены партыяй і ўрадам.

Узнімем масы на барацьбу за новыя перамогі

Мы пазвозім чыстку, калі наша партыя ажыццяўляе грандыёзны план другой пяцігодкі, план пабудовы бясклассавага соцыялізма. Германская комуністычная партыя пераймае нашы метады ў барацьбе з фашызмам.

Адсюль, таварышы, бачыце, што будаўніцтва соцыялізма ў нашай краіне ёсць непарыўная і неадлучная частка барацьбы пролетарыята ўсяго свету за міжнародную пролетарскую рэвалюцыю.

Чыстка па Беларусі ўжо зараз паказала, што КП(б)Б значна ўзняла сваю баяздольнасць. У далейшым ходзе чысткі мы павінны яшчэ больш узнімаць энтузіязм рабочых і калгасных мас, яшчэ больш крытыкаваць нашы недахопы, крытыкаваць бязлітасна, не зважаючы на асобы.

У часе чысткі трэба мацней біць па праваму апартунізму, галоўнай небяспецы, «левых» загібах і прымірэнчых адносінах да іх, яшчэ больш разгарнуць самакрытыку. Мы павінны нашу чыстку ўзняць на яшчэ вышэйшую ступень.

Пад кіраўніцтвам нашай партыі і геніяльнага правадыра т. Сталіна мы пераможам усе часовыя труднасці і паставім справу так, што нашы совецкія ўстановы будуць працаваць па-новаму, па-большэвіцку, працаваць так, каб заваёўваць усё новыя і новыя перамогі па ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва. **(Апладысменты).**

УСЕБЕЛАРУСКАЯ ПРАДКАСТРЫЧНІЦКАЯ ВЫТВОРЧАЯ ПЕРАКЛІЧКА ПА РЭАЛІЗАЦЫІ ПАСТАНОУ ЛІПЕНЬСКАГА ПЛЕНУМА ЦК І ЦКК АБ РАБОЦЕ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

Фабрыка „Сцяг індустрыялізацыі“ можа і павінна даваць прадукцыю добрай якасці

Дрэнная якасць прадукцыі—в'іна выключна наша

Пяцігадовачны рабочы калектыў віцебскай швейнай фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі», абмяркоўваючы на вучастковых і цэхавых сходах адозву ільнаперапрацоўчай фабрыкі «Дзвіна», аднадушна ўключаецца ў перадкастрычніцкую пераклічку, абвешчаную газетай «Звязда» і ў спаборніцтва на права ўдзела ва ўсебеларускім злёце ўдарнікаў якасці і аўладання тэхнікай.

Наша фабрыка, пабудаваная па апошнім слове тэхнікі, на працягу доўгага часу не выходзіць з глыбокага прарыва. Не глядзячы на праводзімую карэнную перабудову работы фабрыкі, мы яшчэ вытыскаем дрэнную прадукцыю, якая зусім не здальная запатрабаванню спажыўца. Асабліва дрэнную якасць прадукцыі выпускаюць палітовы і бручны цэхі, з-за чаго ў канцы мая пастановай Наркамлёгпрама СССР цэх паліто быў часова закрыт. Атпак, і зараз, пасля праведзенай рэарганізацыі цэхаў, фабрыка працягвае выпускаць бракаваную прадукцыю. Амаль ва ўсіх цэхах ёсць значная колькасць перабрак.

Такое становішча надалей нецярпіма. Гэтаму злачынству перад дзяржавай, перад рабочым класам і калгаснай масай мы раз'ялі наклаці канец. Няма абсалютна ніякіх об'ектыўных прычын для таго, каб выпускаць нядобраякасную прадукцыю. **У выпуску бракаванай прадукцыі вінаваты выключна мы самі.**

Мы маем на фабрыцы не малую колькасць сапраўды добрых ударнікаў, як Сінякова, Альферман, Оснас, Зайдус і інш., якія паказваюць узорныя прыклады змагання за якасць. Але не мала і такіх як Рагадынская, Сахалінская, Багарад, Левін, Бычкоўская, Кац, Юдовіч і ім падобныя, якія ганьбяць нашу фабрыку. **Супроць гэтых бракаробаў мы і накіроўваем усю ярасць пролетарскай грамадзкасці.**

Мы ўзяліся за карэнную перабудову ўсёй сістэмы вытворчага працэса, тасненачала кіраўніцтва цэхамі, участкамі, на аснове практычнага прыстасавання да новых умоў рашэння ЦК УсеКП(б) аб Донбасе, чыгуначным транспарце, а таксама на аснове рашэння ліпеньскага пленума ЦК і ЦКК КП(б)Б аб рабоце прамысловасці.

Сваё ўключэнне ў перадкастрычніцкую пераклічку і спаборніцтва на права ўдзела ва ўсебеларускім злёце ўдарнікаў якасці мы адзначаем разгортваннем па фабрыцы вытворча-культурнага паходу, як новай формы і метада вытворча-масавай і культурнай работы. У часе правядзення пахода мы ставім сваёй мэтай узняць на вышэйшую ступень соцспаборніцтва і ўдарніцтва, ахапіць 100 проц. рабочых і работніц індывідуальнымі соцдагаворамі.

Ужо зараз мы штодзённа ў часе першага перапынка праводзім сходы па змённа-сустрэчным планаванні. Як новую масавую форму вучобы на аўладанні тэхнікай мы арганізоўваем масавыя грамадзкія залікі рабочых па лепшае веданне сваёй машыны, тэхнікі апрацоўкі сваёй аперацыі і вытворчага працэса. Мы арганізоўваем пізады вытворча-культурны актыў на ўчастках як грамадзкіх інспектараў па якасці, кантрольных пастоў па якасці, арганізатараў аховы машын, санітарных пастоў і г. д. Ужо зараз мы налічваем такі актыў, у колькасці 800 чалавек, які з'яўляецца магутнай зброяй у барацьбе за выкананне мерапрыемстваў вытворча-культурнага паходу.

Уключаючыся ў перадкастрычніцкую пераклічку і падрыхтоўку да 15-годдзя беларускага злёта ўдарнікаў якасці, абавязваемся сустрэць XVI-ую гадавіну Кастрычніцкай рэвалюцыі перавыкананнем прамфінплана за трэці квартал і кастрычнік, рашуча палепшыць якасць прадукцыі, не дапускаць ніводзнага выпадку зварота гатовай прадукцыі са склада, змагацца за ўшчыльненне рабочага дня, працаваць поўных 420 мінут у змену кожным рабочым.

На лепшую рэалізацыю пастаноў ліпеньскага пленума ЦК і ЦКК КП(б)Б у часе пераклічкі, на поўнае выкананне колькасных і якасных паказальнікаў прамфінплана мы выклікаем на соцспаборніцтва рабочых, работніц і ІТР швейных фабрык «КАСТРЫЧНІК» (Менск) і «ПРАФІНТЭРН» (Віцебск).

Па даручэнні рабочых, работніц, ІТР, служачых швейнай фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі»:

УДАРНІКІ І УДАРНІЦЫ: Сінякова, Цілаграфічык, Пескіна, Краскін, Златкіна, Оснас, Сяргавіч, Катушэнка, Лінкевіч, Маркавіч, Ізсенкін, Дзяткін, Лур'е, Соснін, Рэўзін, Раманоўская, Левін, Гурына, Масцікава, Палякова, Ром, Янаўлева, Пасрэзнікава, Курносаў, Лафаенка, Гальбрайх, Галубкіна.



Агульны выгляд фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі».

СЛОВА МАЕ УДАРНІЦА ФАНЯ СІНЯГАВА

У нашым бручным цэху, як і на ўсёй фабрыцы «Сцяг індустрыялізацыі», абмяркоўваўся зварот фабрыкі «Дзвіна», па ініцыятыве якой «Звязда» абвясціла перадкастрычніцкую пераклічку.

Уключэнне ў пераклічку нашага цэха абавязвае нас многаму, бо мы як ні адзін другі цэх нашай фабрыкі «праславіліся» дрэннай якасцю прадукцыі. Брак і пераробкі ўвайшлі ў сістэму работы нашага цэха. Між тым гэты недахоп можна лёгка знішчыць пры ўмовах, калі кожная работніца, кожны рабочы будзе адносіцца сур'ёзна да сваёй работы.

Я ў цэху лічуся ўдарніцай. І гэтым я ганаруся. Званне ўдарніцы для мяне асабліва дорага, бо я заваявала яго сваёй упартай работай, добрасумленнымі адносінамі да сваіх абавязкаў.

Я працую на 26-й аперацыі — строчы верхняй кішэні і ніжняй пад кладкі. Маё вытворчае штодзённае задание — **300** адзінак — я сістэматычна перавыконваю: даю **310—350** адзінак. Прычым не вешаю пераробак і брака. За ўвесь час работы на гэтай аперацыі — 7 месяцаў — не было такога выпадка, каб на мяне за псаванне прадукцыі быў складзен акт.

Мая работа залежыць ад папярэдняй аперацыі — другой рукі. Калі другая рука дасць мне дрэнную прадукцыю, то гэта, зразумела, адаб'ецца і па маёй рабоце. Для таго, каб забяспечыць нармальную работу патока, я заключыла з тав. **Сіроткінай** — работніцай папярэдняй аперацыі — соцдагавор, у якім яна абавязалася даваць мне прадукцыю выключна добрай якасці. Гэты абавязак **т. Сіроткіна** выконвае.

Добрая якасць прадукцыі залежыць і ад самой машыны. Вось чаму я машыну беражу, як вока. Заўсёды прыходжу на работу за поўгадзіны раней гудка, з тым каб у поўнай спраўнасці прыняць машыну. На працягу дня я машыну некалькі разоў змазваю. Яна працуе бесперабойна.

Для таго, каб даваць добраякасную прадукцыю, трэба перш за ўсё, уважліва адносіцца да сваёй работы. Вось, адночым мне папала кішэня цёмнага колера, у той час, калі брукі былі светла-сінія. Добра ведаючы, што калі гэту кішэню прыстрачыць, то пасля прыдзецца рабіць перапрацоўку, я гэтыя брукі з кішэняй звярнула назад, не дапусціўшы, каб з гэтым дэфектам яны пайшлі далей на канвеер. Гэты момант я падкрэсліваю таму, што ў нашым цэху замена колераў — сістэматычнае з'явішча.

Я не толькі сур'ёзна адношуся да сваёй аперацыі, але калі нападае мне работа з дэфектам на віне папярэдняй аперацыі я зараз-жа прымаю меры па знішчэнні гэтага дэфекта. Вось, нядаўна быў выпадак, калі мне папалі брукі з распоранымі швамі ў пражмы. Колькі пар брук я тут-жа перарабіла, заадно дала знаць ад гэтым дэфекце работніцы, якая ў гэтым вінавата, паказала ёй як трэба выпускаць добраякасную прадукцыю.

У нашым цэху ёсць яшчэ цэлы рад добрых ударнік, як-та т. **Сіроткіна, Стэранзат** і інш. Іх работа—лепшы доказ таму, што якасныя паказальнікі прамфінплана могуць выконвацца, і калі ў цэху ўсё-ж ёсць шмат пераробак, то гэта выключна таму, што рад работніц проста нядбайна адносіцца да выканання сваіх аперацый. Такія работніцы як **Бархан, Бачуркіна, Шараўтушава, Жалязняк** і інш., якія даюць сістэматычна бракованую прадукцыю, ганьбяць наш цэх, усю нашу фабрыку. У прыватнасці, у наш цэх улілося шмат малацых новых работніц, якія патрабуюць узняцця кваліфікацыі. Між тым, цэхавы тэхгурток працуе дрэнна, з вялікімі перабоямі.

Недастучальным з'яўляецца той факт, што на нашым участку адсутнічае інструктар. Маладыя работніцы працуюць абсалютна без усякага інструктажа. Часцяком у рабоце бываюць тормазы з-за адсутнасці інструктара, няма каму па-ходу іх выпраўляць.

Уключаючыся ў перадкастрычніцкую пераклічку я, як старая работніца (працую на швейнай прамысловасці з 1919 г.) **абавязуюся ўзяць шэфства над маладымі малакваліфікаванымі работніцамі.** Маёму прыкладу пранду паследаваць усіх старых работніц фабрыкі. Мы павінны ва што-б там ні стала сустрэць XVI гадавіну Кастрычніка поўнай перамогай у выкананні колькасных і асабліва якасных паказальнікаў прамфінплана.

Работніца - ударніца бручнага цэха фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» СІНЯГАВА ФАНЯ.

40 аперацый прайшло паліто з дэфектамі

База Саюзшвейбыта паведамляе: з 7-га па 12-е верасня са швейнай фабрыкі **«Сцяг індустрыялізацыі»** на базу паступіла: **2.322** касцюмы, з іх **1.000** шт. бракованых, **8.992** пары штаноў, з іх бракованых **500** пар. Зімовых польтаў **745**, з іх бракованых **394**.

У чым справа, дзе прычыны таго, што фабрыка ўсё яшчэ выпускае недобраякасную прадукцыю?

Зайдзіце ў любы цэх і вы ўбачыце іх сваімі вачыма. Ледзь пераступіце парог цэха пальто, як адразу-ж натрапіце на велізарныя горы бракованай прадукцыі. Ля іх мітусяцца прыймачыкі, расцэньшчыкі брака — людзі, якія спецыяльна займаюцца пераробкамі. Такі малюнак убачылі і мы, калі 13 верасня ўвайшлі ў цэх.

Ледзь зрабілі мы з майстрам другога ўчастка т. **Шапуравым** некалькі крокаў, як насустрач нам хваляючыся, раз махваючы рукамі спяшаецца работніца 3-га ўчастка т. **Сямёнава**.

— Калі, нарэшце, другі ўчастак, — саворыць яна — спыніць тармазіць нармальны ход усяго патока. Кожны дзень мы трацім па 2-3 гадзіны толькі таму, што наша работніца **Зільберборг** не спраўляецца даваць нам прадукцыю. Вось і зараз ужо больш 30 мінут, як я выключна з-за гэтай прычыны гуляю, і ў рэзультаце, замест **200** адзінак — даю не больш **60-80**

Тав. **Сямёнава** палкам мае рацыю. На працэсе ўшыўкі правага рукава стаіць работніца **Зільберборг**. Каля яе нарэшта накапілася груда сапсаваных ёю-ж польтаў. Зараз яна іх перапраўляе і гэтым самым затрымлівае наступную аперацыю. Зільберборг вядома у цэху, як работніца, якая сістэматычна псуе прадукцыю. Майстар Шапураў паказвае нам не работу — крывая сшыўка рукавоў, шмат рук. І ўсё ім не дашытыя і т. д.

Зільберборг — не выключэнне. Радам з ёю на працэсе падборкі рукавоў працуе работніца Раскіна. Працуе абы-як, заўсёды падбірае рукавы не адпавядаючыя патрэбным нумарам. Частыя выпадкі калі да чорнага пальто яна падбірае рукавы сінага або шэрага колера. Работніцы наследуючых аперацый **Левіна, Сверская і Мартынкоўская** таксама ніядбайна адносяцца да сваёй работы, прапускаюць дрэнную работу далей на канвеер.

Цяжка знайсці такі працэс, дзе-б сапраўды людзі адносіліся сур'ёзна да сваёй работы. Вось, на працэсе на вышыўцы кромак у полы стаіць работніца **Сеўбанова**. Яе работа нікуды не вартая. Заўсёды адна пала атрымлівацца даўжэй за другую.

Ну, а, што робяць кантралёры, у прыватнасці кантралёры данага другога участка **Ільшова і Левіт?** Мітусяцца, бегаюць па цэху, крычаць, але ў дэталі работы не ўваходзяць. Простая нядбайнасць, абыякавасць. Падамо характэрны прыклад таго, як цэхавая адміністрацыя зацікаўлена ў якасным выробе прадукцыі. На манежоне ў самым цэнтры цэха на віду ва ўсіх вісіць пальто. Не пальто, а нейкая пачвара. Уся падкладка запэцканая, перад перакручан, полы ідуць бокамі, левы бок каўнера звужан, правы на палтара сантымэтра шырэй стандарта.

Гэтае «пальто» прайшло 40 аперацый і ніхто не звярнуў увагі на тое, што пачынаючы з першай аперацыі да самай апошняй (засталося толькі пачысціць і адлаць на прыёмку) пальто псавалі і палта ўдала «калечылі». Міма гэтака шкодніцкага факта прайшлі таксама майстар участка **Сараваўскі** і інструктар **Фельдман** і толькі выпадкова на гэтае пальто натрапіў загалчык АТК т. **Рэўзін**.

Ці можа даваць цэх добраякасную прадукцыю? Так, можа. Для гэтага цэх мае абсалютна ўсе ўмовы. Лепшы доказ гэтаму — работа сапраўдных ударнікаў па якасці. Маладая работніца тав. **Фінкельштэйн**, якая стаіць на працэсе падборкі вярхоў да каўнераў валоная ў цэху як работніца, якая заўсёды добрасумленна адносіцца да выканання сваёй аперацыі. Яе работа самая акуратная. Брака і пераробак тав. **Фінкельштэйн** не ведае.

Работніцы-ўдарніцы **Зайцава і Булянчыкава**, якія стаяць на працэсе шаметвання падбартоў, заўсёды робяць правільную пасадку, таксама не маюць пераробак, брак давялі да нуля. Тав. **Зайцава** нават спраўляецца на двух аперацыях, даючы выключна добраякасную прадукцыю.

Уся бяда ў тым, што цэхавая адміністрацыя, у прыватнасці, начальнік цэха **Саламонік**, яго памочнік **Эйдэльман** і вялікарны штат інструктароў і кантралёраў кіруюць «наосуч», не ўваходзяць у дэталі работы кожнай аперацыі, кожнага працэса. Т. т. **Саламонік і Эйдэльман** усё яшчэ цялягаюць лібералізмам з сваімі інструктарамі і кантралёрамі, якія нядбайна адносяцца да сваіх абавязкаў.

Мы ў кароткіх рысах паказалі работу толькі аднаго цэха пальто, таго самага цэха, які ў мае пастановай Наркамлегпрама СССР з-за вялізарнай колькасці брака і пераробак быў закрыт. Але і ў астатніх цэхах справа не лепш. Аб гэтым з усёй яскравасцю сведчыць выпэпірквезіовая зводка базы Саюзшвейбыта.

А пара, даўно пара ўжо спыніць агідны выраб прадукцыі. **Фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі»**, пабудаваная па апошнім слове тэхнікі, укамплектаваная лепшымі тэхнічнымі сіламі, забяспечаная абсалютна ўсім як сыр'ём, матэрыяламі, так і машынамі і падрыхтаванай колькасцю рабочай сілы,—**можа і павінна даваць спажыўцу выключна добраякасную прадукцыю.**

Уключыўшыся ва ўсебеларускую перадкастрычніцкую пераклічку **якасны** рабочы калектыў фабрыкі павінен сваю творчую актыўнасць і энтузіязм накіраваць на неадкладнае ажыццяўленне пастановы ліпеньскага пленума ЦК і ЦКК КП(б)Б аб рабоце прамысловасці з тым, каб сустрэць вялікае свята — XVI гадавіну Кастрычніцкай рэвалюцыі поўным выкананнем колькасных і асабліва якасных паказальнікаў прамфінплана.

Арк. ЗАРУБЕЖНЫ.

Пабудуем эскадрыльяю імя Кагановіча

ЦСПСБ і ЦП саюзаў, што вы зрабілі па зборы сродкаў?

Ініцыятыва перадавых пролетарыяў і калгаснікаў Беларусі аб пабудове эскадрыльі імя тав. Кагановіча павінна была быць у першую чаргу падхоплена профсаюзнымі арганізацыямі. На іх абавязку ляжала разгарнуць шырокую масавую работу на прадпрыемствах і ўстановах, аперацыйна, па-баявому кіраваць кампаніяй.

Між тым, факты паказваюць, што профсаюзныя арганізацыі не праявілі выстарчальнай актыўнасці, такой, якой патрабуе важнасць справы. Прычына стане зразумелай, калі дадаць, што нават ЦСПСБ і ЦП саюзаў фармальна падышлі да кампаніі збора сродкаў на пабудову эскадрыльі, не паказалі прыклад нізавым арганізацыям. Даволі сказаць, што ЦСПСБ абмежаваўся выпісваннем агульнай пастановы, не наладзіўшы аперацыйнага кіраўніцтва ходам кампаніі. Невыпадкова культмасавы аддзел ЦСПСБ не мае нават вестак як ідзе гэта кампанія па саюзах, якую работу саюзы праводзяць у гэтым напрамку.

Не лепш стаіць справа і ў ЦП саюзаў. Яны таксама, як і ЦСПСБ, фармальна ўключыліся ў кампанію. Культмасавая работа вакол кампаніі разгорнута слаба, няма таксама ўліка збора сродкаў.

ЦП саюза працаваты не змог даць даніць, колькі па іх саюзу сабрана сродкаў. Саюз прамадскага харчавання мае весткі толькі з 11-ці раёнаў, у якіх сабрана 6.865 руб. Такое-ж прыблизна становішча і ў ЦП саюза сельпром, табачна-брадзільнай прамысловасці, швейнаў і інш. Саюзы, як відаць, не зразумелі, што праводзіць такую сур'ёзную кампанію нельга самацёкам, што трэба разгарнуць сапраўды шырокую масава-палітычную работу, соцыялістычнае спаборніцтва паміж асобнымі рабочымі, цэхамі, брыгадамі, цэлымі прадпрыемствамі і раёнамі.

Як выключэнне трэба адзначыць ЦП саюза торфасланцовай прамысловасці. Па 17-ці прадпрыемствах гэтага саюза, дзе працуе 8.350 чал., сабрана 47.115 руб. Праведзеная масавая работа па мабілізацыі рабочых на хутчэйшае выкананне свайго абавязка перад краінай дала свае вынікі. Астатнія саюзы павінны браць прыклад з саюза торфасланцовай прамысловасці.

Задача ЦСПСБ, ЦП саюзаў, райпрофсаветаў узначаліць ініцыятыву перадавых рабочых на хутчэйшае завяршэнне збора сродкаў, Шырокае растлумачэнне важнасці і значэння кампаніі ў цэхах, брыгадах, шырокае разгортванне соцспаборніцтва, канкрэтнае, аперацыйнае кіраўніцтва ходам кампаніі — неабходныя ўмовы для забяспечэння перамогі.

На бягучым рахунку 811.589 рублёў

ЗА 19 ВЕРАСНЯ на бягучы рахунак Дзяржбанка № 160-7814 паступіла ўсяго **2.960 руб.** Ад арганізацый і ўстаноў г. Менска — Белпрамзабытсаюза — **489 руб.**, УВСР № 98 № 215 р., Белшвіпротэста — **104 руб.**, цэнтр. рабочай паліклінікі — **98 р.**, Астрашыцка-Гарадзецкага сельсавета — **71 р.**, ад торфарацелі «Чырвоная зарэ» — **47 руб. 3 рэйкі**: ПЕТРЫМОЎСКАГА — **913 р.**, РЭЧЫЦКАГА — **900 руб.** і МОЦІЛАЎСКАГА — **121 р.**

З ПАЧАТКА ЗБОРА НА БЯГУЧЫМ РАХУНКУ — 811.589 РУБ.

Уносяць і выклікаюць

Я, рабочы малтажнага цэха менскай абутковай фабрыкі імя тав. Кагановіча, увношу ў фонд пабудовы эскадрыльі імя т. Кагановіча **15 руб.** і выклікаю паследаваць майму прыкладу ўсіх рабочых малтажнага цэха.

ПАГОСКІ.

Рабочыя арцелі імя Ланцуцкага (Барысаўскі раён) пастанавілі адлічыць у фонд пабудовы эскадрыльі 2 проц. месячнага заработка, што складае **200 руб.** і выклікалі паследаваць іх прыкладу рабочых вольнай арцелі «Чырвоны Кастрычнік».

Працаўнікі барысаўскага лесграўхімсаюза ў ліку 15-ці асоб унеслі на пабудову эскадрыльі **75 руб.** і выклікалі працаўнікоў барысаўскага лесграўгаса.

Калгаснікі калтаса «Мопат», Чолатканга раёна, унеслі на пабудову эскадрыльі імя т. Кагановіча 200 рублёў і выклікалі калтас «Труд».

Мажэйкінскі сельсавет, Клімавіцкага раёна, сабраў 159 рублёў. Збор працягваецца. Сельсавет выклікаў на соцспаборніцтва Міслаевіцкі, Галіцкі і Звенчанскі сельсоветы.

Працоўныя Камарынскага раёна ўнеслі на пабудову эскадрыльі імя тав Кагановіча 1.330 рублёў.

ЕЛЬМАН.

Комсамольцы Крычаўскага цэментнага абвясцілі культпаход за ачыстку будаўнічай пляцоўкі

Крычаўскі цэментны завод знаходзіцца напярэдадні канчатковага пуска. Зараз выпрацоўваюцца вылучэнні ў часе пробнага пуска дэфекты мантажа асобных агрэгатаў, заканчваецца мантаж дэталяў.

Але пляцоўка завода ўсё яшчэ нагадвае часы будаўніцтва: жалезны лом, кусікі дроту, дошкі, балты, гайкі, шкло і шмат іншых каштоўнейшых дэфіцытных матэрыялаў раскіданы па ўсёй пляцоўцы. Горы смецця, адсутнасць нават памёкаў на дарожкі — вось малюнак заводскага двара.

Гэтымі днямі група комсамольцаў цэментнага завода звярнулася праз газету **«Соц. шлях»** з лістом да ўсіх рабочых, у якім прапануе прывесці заводскі двор у культурнае становішча.

— «Сабраць лом, ачысціць двор завода ад смецця, зрабіць распланіроўку і засадзіць яго дрэвамі, — пішуць комсамольцы, — наша баязная задача, якую мы павінны вырашыць усім комсамольскім калектывам».

Комсамольцы прапанавалі правесці суботнікі па ачыстцы і азеляненні заводскага двара. Заклік комсамольцаў выклікаў вогнуці рабочых усіх цэхаў. Якраз пасля апублікавання іх ліста быў атрыман нумар «Правды», у якім апавяшчаецца аб каштоўнейшым вопыце фабрычых Горловкі. Гэта падала ліста комсамольцаў яшчэ большую актыўнасць. У адказ на гэты ліст, рабочыя ПЭС патрабавалі арганізацыі 15 верасня агульна-заводскага субботніка і ўзялі па сябе абавязак пабудаваць у гэты дзень пераход праз чыгуначную калею завода да рабочага пасёлка.

— Ідучы з дому на работу рабочы не павінен мясіць грязь, — заявілі яны, патрабуючы пракладзі тратуар.

Сумяшчаючы спраўную работу агрэгатаў з упарадкаваньем станоўішчам заводскага двара патрабавалі рабочыя брыгады Марты Зуевай.

Бюро парткалектыва завода, абмяркоўваючы ліст групы комсамольцаў, пастанавіла ўзначаліць гэты рух і правесці канкрэтныя мерапрыемствы з тым, каб помсцтны завод — дзіцяці соцыялістычнай пашчоўкі — меў культурны і ўпарадкаваны двор.

Калектыўны карэспандэнт «Звязды» — **СОЦЫЯЛІСТЫЧНЫ ШЛЯХ».**

Да чысткі парт'ячэйкі Наркомасветы

Ліквідаваць спадчыну нацдэмаўшчыны

А. ДЖЭЛЮК, В. ЗАЙЦАЎ

У «Звязде» і «ЗКП» пісалася ўжо аб тым, што беларускія нацдэмы не мала папрацавалі ў галіне мовы, тэрміналогіі і граматыкі. Успомнім, з якім палетэтвам Ластоўскія, Некрашэвічы, Лёйкі і іх паслядоўны ідэйнік выкідваць з беларускай мовы ўсякае разалюцыйнае слова.

Стварыць бар'ер паміж беларускай мовай і мовай працоўных братэрскіх рэспублік Саюза ССР і раней усяго — расійскай мовай—вось куды мецілі контр-рэвалюцыйныя нацдэмы.

У святле гэтых контр-рэвалюцыйных імкненняў беларускі нацдэмаў будзе ўчаўне разумелым [illegible] становішча пастаноўкі выкладання расійскай мовы ў масавых беларускіх школах. У беларускай політэхнічнай школе расійская мова вывучалася і вывучаецца як прадмет в тэрміна года навучання. Але трэба проста сказаць, што вывучэнне расійскай мовы ігнаравалася ў масавых школах Беларусі. Ні Наркамасветы, ні работнікаў адзелаў нарасветы, ні прафесіянальныя арганізацыі работнікаў асветы школьні не клапаціліся тое, што вучні па сканчэнні сямігодкі не ведалі расійскай мовы. Па прыкладу шумяцкіх-шыльбістаў на Ўкраіне беларускія нацдэмы пратыгаваліся ў адносінах да расійскай мовы тэорыі: «чым горш, тым лепш». Буржуазныя нацыяналісты ў сваіх мэтах на растаўрацыю капіталізма, арыентуючыся на буржуазны Захад праводзілі сваю контрэвалюцыйную палітыку на алтыр працоўных Беларусі ці пролетарскай Масквы. Чым горш на іх «вучоні» вучань уладаў расійскай мовай, тым менш для яго была небяспека шапасні над умыкі расійскай пролетарскай культуры.

У Беларусі не было такіх спецыяльных навучальных устаноў, якія-б рыхтавалі выкладчыкаў расійскай мовы для беларускіх школ, не рыхтаваліся яны і для расійскіх школ БССР. Мы не можам прывесці ні аднаго факта, калі-б кіраўніцтва Наркамасветы склікала выкладчыкаў расійскай мовы і літаратуры на курсы на падвышэнні кваліфікацыі. І гэта ў той час, калі выкладанне гэтых прадметаў у школах сямігодках у большасці даручалася весні зусім некваліфікаваным у гэтай галіне настаўнікам. Расійская мова і літаратура ў большасці выкладаў давалася ў школах як дагрузка ўсім тым, у каго было мала лекцый,—яе выкладалі і выкладаюць яшчэ матэматыкі, прыродаведы і нават... фізкультурнікі, як лалатак да сваёй асноўнай работы. Часта пры разсмаркаванні расійскай мовы ў школах прымаліся «прыцыпы», што трэба-ж даць чалавеку зарабіць, зусім не лічачыся з яго падрыхтоўкай. У большасці-ж выкладанне расійскай мовы і літаратуры вёў настаўнік беларусазнаўства.

Беларускія нацыянал-дэмакраты ў свой час многа ўвагі звярталі на падрыхтоўку сваіх кадраў праз так званыя вышэйшыя курсы беларусазнаўства. Гэтыя настаўніцкія курсы яны бяжкуцца палкам зрабіць сваёй нацдэмаўскай школай. Праз лідэраў нацыянал-дэмакратызма, сяброўных у Наркамасветы і Інбелкульце (на чалавек Бел. Акадэміі Навук), яны прасеквалі гэтыя курсы такім чынам, каб на іх трывалі людзі з нацдэмаўскай «закваскай». У якасці метада «праверкі» настаўніцтва, якое шло на гэтыя курсы для перакваліфікацыі, нацдэмы давалі пісменныя работы на тэму: «Як я уяўляю дому сябе беларусам». Па адказах на гэту тэму яны і вызначалі настаўнікаў —«свядомы», або «несвядомы» ён беларус. «Свядомым» нацдэмы называлі таго, хто палкам стаяў на пазіцыях нацыянал-дэмакратызма. На курсах беларусазнаўства правялася падвышэнне нацдэмаўскае «павышэнне кваліфікацыі» і скончаліся гэтыя курсы ўрачыстымі выпускамі, на якіх лідэры нацдэмаў рабілі генеральную нацыянал-дэмакратычную пачатку шляхам выступленняў з урачыстымі прамовамі.

Вось што, напрыклад, гаварыў вядомы нацдэм Лёйк на адным з выпускаў гэтых курсаў:

«Калі вы параўнаеце сябе з тым, чым вы былі раней і цяпер, то адразу будзеце адчуваць сябе новымі, духоўна перараджанымі. Вы ўжо не тое, чым былі раней, бо пакрабілі плады і таго дрэва, якое называецца «беларускай справай, беларускім адраджэннем». Вы былі ўведзены ў святое святых беларускай справы і расцярыліся вам вочы вашы, і даведаліся вы аб тайне вазрасцення бацькаўшчыны нашай, маткі Беларусі. Вашы свечкі запалены і вы робіцеся апосталамі «беларускай справы»... Уважліва слушце за сабой і не забывайце падліваць масла ў свецільнікі вашы, каб было з чым сустрэць яе—Белую Русь, калі яна прыйдзе судзіць нас ва ўсёй славе сваёй».

Адзін стыль чаго каштуе,—проста з евангелля! А якую Белую Русь нацдэмы абіраліся сустракаць—гэта працоўным Савецкай Беларусі добра вядома.

І вось гэтым то кадрам, заканчваючым курсы беларусазнаўства, даручалася «выкладаць» і расійскую мову. У Менскім беларускім вышэйшым педінстытуце на літаратурна-лінгвістычным аддзяленні гісторыю расійскай мовы, навукоўную граматыку расійскай мовы і сучасную расійскую мову да апошняга часа выкладаў прафесар **Бузун**, прыкрываючы сваю брудную буржуазна-нацыяналістычную справу тогай вучонага.

Разгромленае, але надабітае нацдэмаўскае акводзе, карыстаючыся стратай большэвіцкай пільнасці з боку органаў Наркамасветы і прафгрэмаўскай работнікаў асветы, у сваёй чарговай пераўсці да расійскай пролетарскай культуры, дайшло да таго, што ўхітралася ў радзе месц зусім выкладаць а вучэбных планаў семігодак выкладанне расійскай мовы. Гэта-ж факт, што яшчэ ў мінулым 1932-33 навучальным годзе ў Мокшанскай ШКМ Віцебскага раёна за ўвесь год не было дана ні аднаго урока расійскай мовы. У Прыбытхаўскай ШКМ, Гомельскага раёна ў першым паўгоддзі таксама не было ўведзена выкладанне расійскай мовы і літаратуры. У ШКМ ім. «Совецкай Беларусі», Касцюковіцкага раёна расійская мова не выкладалася да сакавіка месяца. Можна прывесці яшчэ больш фактаў поўнага ігнаравання вывучэння расійскай мовы, але і прыведзеных дастаткова для таго, каб паказаць, як буржуазныя нацыяналістычныя элементы, якія авалелі ў школы зусім адкрыта праводзілі сваю лінію.

Старое кіраўніцтва Наркамасветы і ДВС для пачынаючых вывучэнне расійскай мовы ў беларускіх (3 група) і нацменаўскіх школах (4 група) прапанавала праграмы і падручнікі расійскіх школ РСФСР гэтых-жа груп, не лічачыся з тым, што дзеці расійскую мову пачынаюць вывучаць упершыню. Ясна, што такая палітыка грала на руку беларускім нацдэмам, бо дзіця не магло асвоіць сістэматычна і цвёрда ведаў у галіне расійскай мовы, што ў канчатковым выніку адрывала падрастаючае пакаленне ад расійскай пролетарскай культуры.

Мы вышэй ужо гаварылі, што ў школах соцыўха вывучэнне расійскай мовы пастаўлена больш чым нездавальняюча. Дні яно і не лліва, бо нацдэмы ў гэтай галіне праявілі бескантрольна. Даволі указаць, што Наркамасветы БССР ніколі не праводзілася не толькі глыбокай, але і наогул якой-небудзь праверкі становішча з выкладаннем расійскай мовы. Не займалася гэтым пытаннем і ЦП саюза працасветы. Інспектары Наркамасветы і адказныя работнікі ЦП саюза асветнікаў пры выездзе ў раёны на грубыя скажэнні нацыянальнікі ў гэтай галіне глядзелі праз пальцы. Мы не можам прывесці ні аднаго факта, калі-б інспаравание вывучэння расійскай мовы было Наркамасветы або ЦП працасветы ўзята на прынцыповую палітычную вышыню. Гэтых фактаў не заўважалі, або стараліся не заўважаць.

Чым-жа інакш вытлумачыць такі факт, калі был. наменікам наркома асветы тав. Белуга на сямнаце настаўніка з Віцебскага раёна аб тым, што Макшанская ШКМ заамчана нацдэмаўскімі элементамі, што нацдэмы ў мінулым навучальным годзе зусім выключылі з работы школы вывучэнне расійскай мовы, кладзецца 24 жніўня 1933 г. рэзалюцыя: «Тав. Казакову (які, да рэчы, у той час наогул адсутнічаў у Менску) пры выездзе ў Віцебск праверыць факты і на месцы разам, з КК—РСІ, прыняць меры». Гэта сама правалілася ў школьным сектары ў інспектара Бразоўскай больш за дзесяць дзён, пакуль наш карэспандэнт не паінфаў да наркома асветы тав. Чарнушэвіча і несказаў аб гэтых апошніх адносінах да сямнаца настаўніка.

Больш чым даўнім, але правільней невыпадковым з'яўляецца і тое, што навукова-даследчы інстытут комвыхавання, праводзячы не адзін раз даследаванне становішча агульна-адукацыйных ведаў вучняў у школах-сямігодках, зусім абыходзіў моўкі пастаноўку выкладання расійскай мовы. Інстытут за ўвесь час свайго існавання не даў ні адзнай метадычнай распрацоўкі і наогул якой-небудзь работы на тэму—як лепш паставіць выкладанне расійскай мовы ў беларускай і нацменаўскай школе, хоць патрэба ў гэтым велізарная. Невыпадкова і тое, што ў плане работы гэтага інстытута на 1933 год зусім выпала такое пытанне, як даследаванне праграмы і распрацоўка методыкі выкладання расійскай мовы, у прыватнасці, у беларускіх школах, не прадугледжана планам і правядзенне даследвання пастаноўкі выкладання гэтага прадмета у беларускіх і нацменаўскіх школах. Мы говорым невыпадковым таму, што гэта ігнараванне абэктыўна з'яўляецца працягам нацдэмаўскай палітыкі «чым горш, тым лепш». Бо нельга-ж прынаць сур'ёзным тлумачэнне нам, дырэктара НДІ комвыхавання тав. Дардана, што ў інстытуце няма і яны не могуць знайсці навуковага работніка-спецыяліста па расійскай мове.

Такой-жа палітыкі трымаўся і інстытут мовазнаўства Беларускай Акадэміі Навук, на чале якога стаяў той самы прафесар Бузун. Ясна, што такая палітычная лінія агульнага не мае в ленінскай нацыянальнай палітыкай партыі, в пролетарскім інтэрнацыяналізмам.

Калі-б НДІ комвыхавання заняўся даследваннем пастаноўкі вывучэння расійскай мовы ў беларускіх школах-сямігодках, дык ён убачыў-бы, якімі абурэнча непісменнымі выходзяць дзеці па сканчэнні школы.

З бягучага навучальнага года ў гор. Барысаве арганізавана першы ў гісторыі БССР расійскі педагагічны тэхнікум. Аб арганізацыі яго мы будзем гаварыць крыху ніжэй, а зараз хочам прывесці факты «шісменнасці» студэнтаў, прынятых на першыя курсы гэтага педтэхнікума.

Вось як напісана дыктоўка студэнткай 1-б курса **Маразевіч**:

«Не каторие товарищи думают, что переход на новый путь, на путь колхозов началася внас три года тому назад. Это верна лишь отчесьти, каечна массая спрашельства калхозов началась в нас три года тому назад...»

І далей:

«Все это верна но для того, чтобы начать этот массовый переход к калхозам надо было б иметь в руках некаторие предварительные условие бещего вообще гаварна не мыслима массовая калхозная движение...»

Гэта вытрымка прыведзена з дыктоўкі былой вучані

САПРАЎДНЫМ ПАДПАЛЬШЧЫКАМ РЭЙХСТАГА—НАЦ.-СОЦЫЯЛІСТАМ—СЛЯДОЎ СВАЙГО ЗЛАЧЫНСТВА НЕ ЗАМЕСЦІ!

ЛОНДАНСКІ КОНТР-ПРАЦЭС

ЛОНДАН, 16.

На вячэрнім пасяджэнні грамадскага суда па справе аб падпале рэйхстага адзін з кіраўнікоў германскай компартыі **КЕНЕН** падрабязна апісаў кожны крок, зроблены ім разам з Торглерам у дзень пажара, канчаючы моментам, калі ў рестаране яны даведаліся, што рэйхстаг гарыць.

Кенен заявіў, што дзесяткі сведкаў маглі-б даказаць бязгадуласць абвінавачання супроць Торглера аднак, улады **НЕ ПАЖАДАЛІ** іх апытань.

Далейшым апытаннем Кенена ўстаноўлена, што пасля заняцця палічыў дома ЦК компартыі 17 лютага Кенен штодзенна бачыўся з уладамі і вёў перагаворы, аднак, яны **НІ РАЗУ** нічога не сказалі аб нібы выяўленым там дакументе аб падрыхтоўцы «паўстання».

Суд далучае да справы агалошаную Кенеам заяву компартыі ад 10 лістапада 1931 года, якая вычарпальна акрэслівае яе **АДМОЎНЫЯ АДНОСІНЫ ДА ТЭРАРЫСТЫЧНЫХ АКТАЎ**, а таксама іншыя аналагічныя дакументы.

***

ЛОНДАН, 18.

Сёння былі заслуханы паказанні сына Торглера Курта. За ўсе 4 тыдні арабывання бацькі ў турме Курту дазволілі толькі адзін раз з ім убачыцца.

Ён ясна бачыў **СЛЯДЫ ЛАНЦУГОЎ НА РУКАХ БАЦЬКІ.** Бацька прасіў паклапаціцца аб падшуканні абаронцы для яго. Гэта, аднак, аказалася немагчымым, бо адвакат патрабаваў 5.000 ганарара ,а між тым матка сведкі атрымлівае ўсяго толькі 45 марак у месяц дапамогі і ёй забаронена прымаць якую-небудзь дапамогу ад партыі, або МОПР'а. Частку патрабуемай сумы ўсёж удалося сабраць але адвакат урэшце **АДМОВІЎСЯ** ўзяць на сябе абарону Торглера.

У апошні раз Курт бачыў бацьку чатыры месяцы назад.

***

ПРАГА.

Адвакат Секаніна прыбыў з Берліна 12-гадовую дачку Торглера, бо паводле яго слоў «жыццё ў цяперашній германскай школе — пекла».

„НА ЛАВЕ ПАДСУДНЫХ— СУЧАСНЫ ЎРАД ГЕРМАНІІ"

СУСВЕТНЫ ДРУК АБ КОНТР-ПРАЦЭСЕ

ПРАГА, 17. (БЕЛТА).

Пад загалоўкам «Контр-працэс, даказваючы **НЕВІНОЎНАСЦЬ ТОРГЛЕРА»**, орган міністэрства замежных спраў «Прагер прэсе» піша:

«Галоўны результат двух дзён працэса ў Лондане ў тым, што паступова склалася думка, спрыяючая для Торглера».

Социял-дэмакратычная газета «Право ліду» разглядае лондаўскі працэс, як «адзін з найвялікшых працэсаў у сусветнай гісторыі, на якім **У РОЛІ ПАДСУДНЫХ ВЫСТУПАЕ СУЧАСНЫ ЎРАД ГЕРМАНІІ».**

Згодна паведамлення вядомага пражскага адваката Секаніна, які вярнуўся з 3-й паездкі ў Германію, ён на падставе перагавораў у Берліне прышоў да высновы, што германскі суд Зак з самага пачатку парашылі не дапускаць да азнаямлення з дакументамі на справе нікога з незалежных ад германскіх улад абаронцаў.

***

ПАРЫЖ, 16. (БЕЛТА).

Газеты асабліва спыняюцца на паказаннях Бергарта ў лондаўскім грамадскім судзе, які заявіў, што ад падпала рэйхстага маглі выйграць толькі нацыянал-социялісты і што абвінавачанне Торглера, Дэмітрава, Папова і Танева — **НЕДАРЭЧНАСЦЬ.**

***

ПАРЫЖ, 17. (БЕЛТА).

Міжнародны камітэт абароны абвінавачаных у падпале рэйхстага апублікаваў ліст Тэйхерта, афіцыяльнага абаронцы Дэмітрава, Папова і Танева адрасаваны адному з віднейшых амерыканскіх адвакатаў прафесару ўніверсітэта ў Лос-Анжэлосе Галахеру, і рашэнне вярхоўнага суда, які адхіляе просьбу Галахера дапусціць яго ў якасці абаронцы Дэмітрава, Папова і Танева.

Суд матываваў сваё адмаўленне Галахеру тым, што апошні «не мае ні паўномоцтваў падсудных, ні згоды афіцыяльнага абаронцы». Характэрна, што Тэйхер і суд на гэты раз павінны былі звярнуцца да новых «матывіровак» адмаўлення, гэта тлумачыцца тым, што Галахер ведае нямецкую мову і з'яўляецца «чыстым арыйцам», г. зн. задавальняе двум умовам, якія выстаўляліся пры адхіленні просьб іншых замежных адвакатаў.

ЗАТРУДНЕННІ ЯПОНСКАЙ КАЛАНІЗАЦЫІ У МАНЧЖУРЫІ

ВЛАДЗІВАСТОК, 16 (БЕЛТА).

Японскія газеты, якія выдаюцца ў Манчжурыі, паведамляюць аб прыбыцці ў Харбін групы ў 45 японскіх ваенных каланістаў, якія дезэртавалі з лагераў, размешчаных у нізінім цячэнні Сунгары

Газеты прызнаюць, што «кліматычныя ўмовы і суровая дысцыпліна стварылі неспрыяючыя настрої» сярод ваенных паселенцаў, якія прывялі да павялічэння выпадкаў іх уцёкаў з гэтых паселенняў.

БЮДЖЭТ ВАЙНЫ

ТОКІО. (БЕЛТА).

На думку «Ніці-Ніці», «паколькі міністр фінансаў Такахасі згадзіўся з патрабаваннямі Араакі і Осумі аб расходах на ваенныя патрэбы», не падлягае сумненню, што бюджэт 1934-35 года акажацца ў яго расходнай частцы найбольшым за ўвесь час існавання Японіі».

Згодна папярэдніх даных, — піша газета, — расходная частка новага бюджэта складзе не менш 2.400 млн. іен, перавышаючы на 100 млн. іен сучасны, які нічыцца рэкордным.

Патрабаванні ваенных ведамстваў на надзвычайныя расходы, паводле слоў «Ніці-Ніці», — даходзяць да 800 млн іен.

ПЕРАД ЛЕЙПЦЫГСКАЙ ПАСТАНОЎКАЙ

БЕРЛІН, 19 (БЕЛТА).

Агенцтва Конці паведамляе, што першая частка працэса аб падпале рэйхстага, якая будзе праводзіцца ў Лейпцыгу, закончыцца паміж 5 і 9 кастрычнікам, пасля чаго працэс будзе перанесен ў **БЕРЛІН.**

Пры ўваходзе ў будынак суда ўсе будуць падпадаць **ПІЛЬНАМУ ВОБЫСКУ.**

АГРАРНАЯ ПАЛІТЫКА ПА-ФАШЫСЦКУ

ШТУЧНАЕ СКАРАЧЭННЕ СПАЖЫВАННЯ С.-Г. ПРАДУКТАЎ, ЗМЯНШЭННЕ ПАСЕЎНАЙ ПЛОШЧЫ

БЕРЛІН, 18 (БЕЛТА).

Урадам выдан закон, які дае міністру зямляробства паўнамоцтвы для прыняцця мер па забеспячэнні «справядлівай цвёрдай цаны» на сельска-гаспадарчыя прадукты.

Гэты закон прадугледжвае стварэнне каперацыйных аб'яднанняў агрорыяў, якія — як піша прэсе — пэўнымі адхіліць нездаровую канкурэнцыю ў вытворчасці і збыце сельска-гаспадарчых прадуктаў.

Газетныя каментарыі прабуюць выставіць новы закон, як меру па палепшанні становішча сельскай гаспадаркі. Па сутнасці-ж гэты закон ва ўмовах падаючай пакупальнай здольнасці шырокіх мас яшчэ больш скароціць спажыванне і зменшыць збыт сельска-гаспадарчых прадуктаў. Адначасова з новым законам орган нацыянал-социялісцкіх аграрыяў «Нацыянал-социялістышэ пандлег» публікуе зварот «аўтарытэтных органаў», у якім катэгарычна прапануецца «заметна зменшыць пасеўныя плошчы».

КАПІТАЛІСТЫЧНЫ „РЭЦЭПТ" СУПРОЦЬ КРЫЗІСА

НЮ-ЮРК, 17.

Сельска-гаспадарчае ведамства высунула дадатковую праграму знішчэння свінога пагалоўя для павышэння цэн.

Фермерам-свінаводам, якія абавязуюцца выканаць праграму, павінна быць прадастаўлена субсідыя, выплачваемая за кошт паступлення падатку за перапрацоўку свінога мяса.

Што датычыць парасят, то ў результаце абодвух праектаў колькасць знішчаных галоў павінна быць даведзена да 5 мільёнаў. Знішчаемае пагалоўе амаль цалкам скарыстоўваецца ў якасці ўгнаення і на іншыя нехарчовыя меты.

ЧАРГОВАЯ ПРАВАКАЦЫЯ НАЦ.-СОЦЫЯЛІСТАЎ

БЕРЛІН, 18. (БЕЛТА).

16-га верасня ў клубе совецкай калоніі адбыўся вечар, на якім прысутнічаў паўпрэд Хінчук і рад іншых членаў паўнамоцнага прадстаўніцтва і гандлёвага прадстаўніцтва. Пасля ад'езду паўпрэда з клуба капя гадзіны ночы туды з'явіліся чатыры члены нацыянал-социялісцкага ахоўнага атрада № 42 у суправаджэнні паліцэйскага і аднаго ў цывільным.

Адштырхнуўшы вартаўніка, усе яны ўварваліся ва ўнутраную прыхожую клубо. Двое занялі выхад і нікога не выпускалі. Чалавек у цывільным падышоў да тэлефона і пачаў нешуды званіць. Пры гэтым ён заявіў, што ў прыхожай клуба на сцяне відаць совецкі герб з серпом і молатам і што гэтага дастаткова, каб «прыняць меры супроць клуба». У адносінах да прысутных у клубе членаў совецкай калоніі нацыянал-социялісты вялі сябе надзвычай грубе. Калі ў клуб прыехаў тэрміновы выкліканы прадстаўнік паўнамоцнага прадстаўніцтва, нацыянал-социялісты хутка пакінулі клуб. Паўпрэдства заявіла пратэст па повяду гэтай новай провакацыйнай выхадкі.

ПАКАЗАННІ ЕЛЕНЫ ДЗМІТРАВАЙ

ЛОНДАН, 19 (БЕЛТА).

Грамадскі суд заслухаў паказанні Елены Дзмітравай, сястры балгарскага комуніста, які абвінавачваецца ў падпале рэйхстага. Сведка абрысавала жыццёвы шлях брата, які паходзячы з рабочай сям'і, прысвяціў усе сілы революцыйнай масавай барацьбе.

На пытанні старшыні суда Прытта Дзмітрава паказала, што брат яе не меў ніякіх адносін да ўзрыва сабора ў Сафіі і што балгарскі фашысцкі ўрад звярнуўся да гэтай правакацыйнай выдумкі, каб апраўдаць лоты тэрор супроць рабочага і сялянскага руху. Дзмітрава зачытала на судзе выпрымкі з артыкула брата, з якога відаць, што ён па працяку ўсіх 35 год сваёй палітычнай дзейнасці выступаў супроць індывідуальнага тэрора. Дзмітрава заявіла, што яна таксама ведала Танева і Папова і што яны таксама былі праціўнікамі індывідуальнага тэрора.

***

ЛОНДАН, 19 (БЕЛТА).

Пасля паказанняў Дзмітравай былі заслуханы паказанні харвата Свізніча, які сустракаўся з Дзмітравым з восені 31 г. да арышту. Сведка ўказаў, што 27 лютага ў дзень падпалу рэйхстага, Дзмітраў быў у Мюнхене. Пацвердзіўшы характарыстыку, дадую Дзмітраву яго сястрою, Свізніч падкрэсліў, што Дзмітраў — прынцыповы праціўнік індывідуальнага тэрора.

Пісменнік Толлер абрысаваў харцёну нацыянал-социялісцкага тэрора, адзірай якога сталі рабочыя і прадстаўнікі інтэлігенцыі.

***

ЛОНДАН, 19. — (БЕЛТА).

Апошні сведка паказанні якога заслухоўваюцца пры адчыненых дзверах, — Эліза Шутц — удава комендэнта рэйхстага ад Кенігсберга. Сведка апісвае абставіны забойства яе мужа нацыянал-социялістамі.

Затым старшыня суда абвяшчае, што публічныя пасяджэнні закрываюцца. Паказанні яшчэ двух сведак будуць заслуханы пры зачыненых дзверах. Назначана пасяджэнні ў складзе Врантынга, Бержэры і Гойса для фармулявання вываду, якія будуць прад стаўлены сёння пленуму міжнароднай следчай камісіі.

***

ВЕНА, 17 (БЕЛТА).

Орган хейміера «Эстэрэйтіш мортенблат» апублікаваў выкрыцці артыста Фербера, выпушчанага нядаўна з Берлінскай турмы Моабіт.

Фербер, камера якога знаходзілася па суседству з камерай Ван дэр-Любе, характарызуе яго, як «прадажнага суб'екта, які за тысячу марак быў-бы здолен падпаліць увесь Берлін». На думку Фербера, Ван дэр-Любе цалкам падышоў для намечанага нацыянал-социялістамі падпала рэйхстага

АНГЛА-ФРАНЦУЗСКІЯ ПЕРАГАВОРЫ

ПАРЫЖ, 18. (БЕЛТА).

Сёння пачаліся англа-французскія перагаворы, у якіх прымаў удзел Дапад'е. Дапад'е адзначыў, што прадстаўнікі англійскага боку робяць паўныя намаганні для заключэння згоды. Заўтра перагаворы адновацца ў прысутнасці Дэвіса (ПАЗШ).

Агенцтва Гавас адзначае, што паміж Англіяй, ПАЗШ, Францыяй і Італіяй ёсць яшчэ па многіх пытаннях разгалосі, але ў адносінах прынцыпа міжнароднага кантроля, як відаць, дасягнута згода пры вядомых агаворках бакоў. Агенцтва падкрэсліває, што перагаворы будуць працягвацца і ў Жэневе, паколькі канферэнцыя па раззбраенні збярэцца толькі 16 кастрычніка.

***

ЛОНДАН, 18 (БЕЛТА).

Ва ўмерана кансерватыўнай «Обсервер» рэдактар газеты Гарвін указвае, што ўся праблема раззбраення падлягае перагляду і шляхі, якія ўжываліся да гэтага часу ў Жэневе, ўжо адпадаюць.

Новыя шляхі Гарвін бачыць у стварэнні шырокай камбінацыі супроць нацыянал-социялісцкай Германіі, указваючы, што, «на шчасце, гэта камбінацыя, як відаць, будзе створана».

— Многія паінфармаваныя асобы,—гаворыць далей Гарвін, — разумеюць гэта, але мала хто аб гэтым гаворыць. Час сказаць праўду. Але ў той-жа час Гарвін вымушан прызнаць, што «Совецкі саюз становіць сабой сур'ёзны фактар міра». Падкрэсліваючы рост мілітарызма ў Германіі, Гарвін заключае, што ні адна краіна, і менш за ўсё Францыя, не можа раззбройвацца, пакуль нацыянал-социялісты не дадуць «выразных абавязацельстваў» устрымлівацца ад агрэсіўных актаў.

Т. ЮРЭНЕУ НА ПРЫЕМЕ У ХІРОТА

ТОКІО.

Міністр замежных спраў Хірота прыняў паасобку ўсіх паслоў і пасланнікаў, у тым ліку т. ЮРЭНЕВА.

Эрыо аб СССР

ПАРЫЖ, 18.

На банкеце, наладжаным радыкал-социялістамі ў Ле-Блан, у прысутнасці паўтаратысячнай аўдыторыі, Эрыо заявіў:

«Я хачу перасцярагчы вас ад тых легенд, якія маюць такое-ж паходжанне, як тыя паклёпніцкія плёткі, аб якіх я часта гаварыў.

Адносна Украіны, якую я аб'ехаў, гаварылі што яна апустошана голадам і ў той-жа час праганявалі каланізаць яе. Дык вось, я магу вам сказаць, што **Я БАЧЫЎ НАРОД, ЯКІ АЖЫЦЦЯЎЛЯЕ ВЕЛІЗАРНЫЯ НАМАГАННІ, КРАІНУ, ЯКАЯ ІНДУСТРЫЯЛІЗУЕЦЦА, ЯКАЯ АВАЛОДВАЕ ВЕДАМІ ШЛЯХАМ УВЯДЗЕННЯ ЗАКОНА АБ АБАВЯЗКОВЫМ НАВУЧАННІ.**

Я бачыў народ, які пабудаваў на адной са сваіх самых буйных рак гідраэлектрычную станцыю выключнай магутнасці і другую па велічыні ў свеце. І калі гэты народ хоча зблізіцца з французскім, калі я чуў там самыя прыязныя і самыя мірныя словы ў адносінах да маёй бацькаўшчыны, то хіба не было маім абавязкам рэспубліканца не радавацца гэтым словам.

Мяне напракалі ў тым, што я сказаў наступнае, будучы ў СССР. «Я перадам вашы прыязныя словы французскаму народу, я ўпэўнены, што ён будзе расчулён імі».

Сёння я перад французскім народам. І я гавару: «Хіба вы не шчаслівы, што дзеля міра і спакою вашых сем'яў і вашых дзяцей мы стараемся скарыстаць усе магчымасці, стараемся дагаварыцца з вялікім народам».

Выступленне Эрыо выклікала бурнае ўхваленне схода.

АБ ХОДЗЕ ЗАГАТОЎКІ І ПЕРААПРАЦОЎКІ ГРЫБОЎ УРАДЖАЮ 1933 г.

Пастанова Совета Народных Камісараў БССР

Совет Народных Камісараў БССР адзначае, што:

а) заготоўчыя арганізацыі БССР, у паасобку НКснабжання і Белкаапсаюз поз на памылі заготоўку і перапрацоўку грыбоў (спазніліся з разгортваннем гэтай важнейшай справы);

б) заготоўчымі арганізацыямі (Белсадгародніной і Белкаапсадгародніной), асабліва іх нізавой сеткай праяўляецца поўная недаацэнка тых магчымасцяй, якія ёсць у гэтым годзе па зборы грыбоў, імі не арганізован збор грыбоў, галоўным чынам белых, для сушкі і марынавання. Уся гэта работа праходзіць самацёкам;

в) раённыя выканаўчыя камітэты недаацэньваюць таксама значэння заготовак і перапрацоўкі грыбоў і на гэту справу не звяртаюць належнай увагі.

Такое становішча з'яўляецца тым больш недапушчальным, што грыбы з'яўляюцца каштоўным дадатковым рэсурсам у харчовым снабжэнні працоўных мас і маюць вялікае значэнне ў выкананні экспартных планаў.

Совет Народных Камісараў БССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Прапанаваць Белсадгародніне, Белкаапсадгародніне, канторы Цэнтрапладгародніне, Тэхлесемкультуры і ОРС'ам леспрамгасаў ужыць рашучыя захады да максімальнага разгортвання збора і заготовак усіх відаў грыбоў шляхам разгортвання масава-растлумачальнай работы сярод калгасаў, калгаснікаў, аднаасобнікаў, вучняў, піанераў і г. д. аб неабходнасці прыняцця ўдзела ў зборы грыбоў, скарыстаўшы для гэтай мэты ўсю вольную рабочую сілу, асабліва ў дні кепскага надвор'я, калі не ўсе калгаснікі заняты на сельска-гаспадарчых работах.

2. Улічваючы добры ўраджай грыбоў, які забяспечвае выгадную арганізацыю прамысловага збора грыбоў самім калгасам, прапанаваць РВК стварыць у калгасах спецыяльныя брыгады (з членаў калгасаў, якія не скарыстоўваюцца на іншых работах) па зборы грыбоў з выплатай ім паўнай колькасці працадзён за зданую цвёрдую норму збора і здачы грыбоў, у адпаведнасці з нарадам праўлення калгаса.

3. Абавязаць НКАсветы даць указанне школам сельскай сеткі аб масавым уключэнні школьнікаў (асабліва ў выходныя дні і пасля вучобы) у збор грыбоў.

Прасіць ЦК ЛКСМБ у аднадзенны тэрмін спусціць дырэктыву ўсім комсамольскім і піанерскім арганізацыям аб уключэнні ў масавы збор грыбоў з растлумачэннем комсамольскай арганізацыі важнага народна-гаспадарчага значэння збора і перапрацоўкі грыбоў.

4. Для заахвочвання збора грыбоў школамі, школьнікамі, піанерскімі і комсамольскімі арганізацыямі, выдзеліць фонд розных вучнёўскіх прылад (апоўкі, сшыткі, ручкі, пер'і, пінолы, гумкі, рысавальныя прылады і г. д). на 100 тыс. руб. Апроч гэтага стварыць прэміяльна-грашовы фонд у памеры 20 тыс. руб.: па лініі БЕЛКААПСАДГАРОДНІНЫ — 10 тыс. руб. і БЕЛСАДГАРОДНІНЫ — 10 тыс. руб.

Белкаапсаюзу — тав. ЦАРОНКУ — на працягу аднаго дня спусціць паказаны фонд па раёнах (у адпаведнасці з пераўленным планам заготоўкі грыбоў).

Кантроль за выкананнем гэтага ўскладзі на намесніка упаўнаважанага камітэта таварных фондаў тав. МАТУСЕВІЧА.

5. Для стымулявання работы варшчыкаў грыбоў (па колькасным і якасным выкананні плана) прапанаваць Народнаму Камісарыяту Снабжэння БССР на сезон варкі (верасень — кастрычнік) уключыць варшчыкаў на цэнтралізаванае снабжэнне па спісу № 2.

Белсадгародніне і Белкаапсадгародніне пад адказнасць т. т. Анікейчыка і Зелічонка ў аднадзенны тэрмін падаць НКснабжэння пераграныя даныя аб колькасці варшчыкаў.

6. Прапанаваць Белплодгародніне і Белкаапплодгародніне і канторы Цэнтрапладгародніны забяспечыць грыбаварчыя пункты тарай у колькасці, якая неабходна для бесперапыннай перапрацоўкі грыбоў у сезоне гэтага года.

7. Адзначаючы, што экспартныя арганізацыі, у паасобку ўпаўнаважаны НК замежнага гандля, не праявілі ініцыятывы па арганізацыі шырокіх мас для збора і перапрацоўкі грыбоў на экспарт і не выканачылі мерапрыемстваў для заахвочвання і зацікаўлення збаршчыкаў, абавязаць тав. ФЛІОРА як на сваёй лініі, так і па лініі падпарадкаваных яму экспартных арганізацый, узмацніць гэту работу і са сродкаў, выкананых для прэміявання арганізацый, якія добра працуюць па экспарце, стварыць неабходны фонд у памеры не менш 15 тыс. рублёў для заахвочвання арганізацый і збаршчыкаў, якія добра разгарнулі работу па зборы і перапрацоўцы грыбоў на экспарт.

8. У сувязі з пагрозай невыканання плана па экспарту белых — сухіх і марынаваных — грыбоў, з мэтай забеспячэння заготовак планавымі заготоўчымі арганізацыямі (Белсадгародніна і Белкаапсадгародніна), забараніць усім іншым заготоўчым і да выканання экспартнага плана праводзіць заготоўку грыбоў (белых, сухіх і марынаваных) у наступных раёнах: Лельчыцкім, Нараўлянскім, Ельскім, Петрыкоўскім, Мазырскім, Терахаўскім, Хойніцкім, Жлобінскім, Парыцкім, Рагачоўскім, Быхаўскім, Бабруйскім, Тураўскім, Плешчаніцкім, Лепельскім, Жыткавіцкім, Рэчыцкім, Кармянскім і Брэзгінскім.

У іншых раёнах да заготовак дапускаюцца і іншыя заготоўчыкі (дапушчаныя да дэцэзатовак), прычым апошнія на падставе пастановы рэспубліканскага камвенцыйнага бюро ад 15 чэрвеня г. г. абавязаны перадаць усе заготоўленыя сухія белыя і марынаваныя грыбы на базы Белсадгародніны і Белкаапсадгародніны для адбора з іх экспартных грыбоў, абавязаўшы базы замяніць іх адкідамі ад экспарта.

9. Даручыць упаўнаважанаму камзагСНК па БССР у аднадзенны тэрмін удакладніць заготоўчыя цэны ў 9 прымежных з УССР раёнах на ўсе віды заготаўляемых грыбоў.

10. Прыняць да ведама заяву Продэкспарта аб тым, што ім устаноўлены спецыяльныя надбаўкі па 15 кап. за кіло для аплаты нізавога сельскага заготоўчыка і варшчыкаў за белыя марынаваныя грыбы, якія адгружаюцца на экспартную базу.

11. Даручыць райвыканкомам і заготоўчым арганізацыям шырока папулярызаваць пастанову СНК БССР ад 9 верасня г. г. «Аб вызваленні ад падаткаў дахода насельніцтва, атрыманага ад збора дзікарастучых плодоў, у тым ліку грыбоў, пры ўмове здачы ім дзяржаўным і кааперацыйным арганізацыям.

12. Даручыць упаўнаважанаму НК шляхоў пры СНК БССР т. ЗГЛЕ даць указанне начальнікам чыгуначных станцый аб прадастаўленні вагонаў пад грыбы і грыбную тару нароўні з іншымі плодагародніні грузамі (бульба, гародніна).

13. Даручыць упаўнаважанаму НК замежнага гандля, Белсадгародніне, Белкаапсадгародніне ў 2-хдзённы тэрмін арганізаваць конкурс на лепшы раён, заготпункт і варачны пункт па заготоўцы і перапрацоўцы белых — сухіх і марынаваных — грыбоў, вылучыўшы для гэтай мэты адпаведныя фонды прэміявання.

14. Ускласці на нам. старшыні РВК па заготоўках штодзенны кантроль за ходам заготовак і перапрацоўкі ўсіх відаў грыбоў.

15. Абавязаць райКК-РСІ (з прыцягненнем секцый РСІ пры сельсоветах, інспектораў па якасці і сакагляду) узяць пад непасрэдны нагляд усе грыбаварчыя пункты, забяспечыўшы якаснае выкананне плана варкі грыбоў і гігіенічны падыход да працэса варкі (чыстка тары, пераробка і выдаленне непрыгодных грыбоў, сартоўка, мыццё і г. д.).

16. Прапанаваць беларускай канторы Дзяржбанка пад адказнасць тав. ФЕЛЬДМАНА забяспечыць бесперабойнае фінансаванне заготовак грыбоў (у поўнай адпаведнасці з узгодненай грыбной прадукцыі) кароткатэрміновым крэдытам у поўнай яе каштоўнасці.

Адначасова даць указанне раённым аддзяленням Дзяржбанка аб бесперабойнай выдачы грашовых знакаў заготоўшчыкам грыбоў.

17. Даручыць камісіі выканання пры СНК БССР праз дэкаду заслухаць даклады Белсадгародніны тав. АНІКЕЙЧЫКА і Белкаапсадгародніны тав. ЗЕЛІЧОНКА аб прынятых мерах па выкананні гэтай пастановы.

18. Прапанаваць НКснабжэння (тав. КАРНАЧОВУ) на працягу 10 дзён распрацаваць парадак размеркавання грыбоў па спажыўцах і ўнесці на зацвярджэнне ЗКАСО.

Абавязаць Белкаапсадгародніну (тав. ЗЕЛІЧОНКА) і Белсадгародніну (тав. АНІКЕЙЧЫКА) на працягу 6 дзён падаць НКснабжэння ўсе матэрыялы аб фактычна заготаўленых грыбах (не экспартных).

СТАРШЫНЯ СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР М. ГАЛАДЗЕД.
КІРАЎНІК СПРАЎ СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР С. КАНДЫБОВІЧ.

18 верасня. 1933 г.

Паведамленні

КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ ПАРТ'ЯЧЭЙКІ НКЗ паведамляе, што 20 верасня г. г. роўна ў 6 гадз. веч. пачынаецца чыстка парт'ячэйкі Наркамзема.

Чыстка адбудзецца ў памяшканні НКЗ, 2 паверх.

Просьба да рабочых і работнікаў цэнтральных і раённых земельных і іншых устаноў прыняць актыўны ўдзел у чыстцы.

Увесь матэрыял аб работе Наркамзема камісія просіць прысылаць на адрасе: Менск, гарадская камісія па чыстцы, вул. Карла Маркса, 14. Правяркому на ячэйцы Наркамзема.

ЯЧЭЙКОВАЯ КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ ПАРТ'ЯЧЭЙКІ НКЗ.

ПК ЦКК КП(б)Б просіць тав. Агеева, б. дырэктара Лёзненскай МТС, з'явіцца ў ПК ЦКК КП(б)Б па сваёй справе.

Просьба да ўсіх партарганізацый, ведаючых аб месцы знаходжання ўказанага таварыша, паведаміць аб гэтым ПК ЦКК (Менск, Совецкая, 55).

ПАРТКАЛЕГІЯ.

ЗАГАД № 601

па Народным Камісарыяце Асветы БССР

19 верасня 1933 г. г. Менск

Аб пераходзе школ на новы правапіс

Пастанова СНК БССР аб зменах і спрашчэнні беларускага правапіса з'яўляецца дакументам, які мае велізарнае значэнне для далейшага развіцця і росквіта Беларускай пролетарскай культуры і мовы.

Выходзячы з гэтага, загадваю сараз-жа перавесці школы на новы правапіс. У мэтах забеспячэння неабходных умоў пераходу на новы правапіс, ажыццявіць наступныя мерапрыемствы:

1. Паставіць пытанне перад прэзідыумам Акадэміі навук БССР аб выданні новага правапіса не пазней 25 верасня г. г. тыражам у 100.000 экземпляраў.

2. Прыняць да ведама заяву ДВС, што граматыкі для 1 канц. ужо выходзяць з друку, а для II канц. здаюцца ў друк на працягу сёняшняга дня. Прапанаваць ДВВ скончыць друкаванне граматыкі не пазней 5-га кастрычніка 1933 года.

3. Аддзелам народнай асветы сумесна з райкомамі саюза працасветы арганізаваць праграпоўку пастановы СНК аб зменах і спрашчэнні беларускага правапіса сярод настаўніцтва, асабліва сярод выкладчыкаў беларускай мовы, а таксама і ўсіх работнікаў культасветных устаноў, забяспечыўшы папулярызацыю гэтай пастановы сярод працоўнага насельніцтва.

4. Прапанаваць т. т. Башкевічу і Дардаку на працягу трох дзён распрацаваць метадычныя ўказанні аб пераходзе школ на новы правапіс.

5. Прапанаваць загадчыкам школ зараз-жа выдзеліць у навучальным плане з ліку галзін, адведзеных на белмову ў 3-й і 4-й групах—5 гадзін, у 5-й і 6-й групах—4 гадзіны, у 7-й, 8-й і 9-й групах — тры гадзіны для азнаямлення вучняў з палітычным значэннем увядзення новага правапіса і практычнага вывучэння змен яго.

Грунтоўнае засваенне новага правапіса павінна праводзіцца на працягу ўсяго курса вывучэння белмовы.

6. Прапанаваць палітсветсектару пад адказнасць тав. Пэляўцова арганізаваць вывучэнне новага правапіса на прадпрыемствах, у калгасах, совгасах, МТС, сялкультуры, чырвоных кутках, забяспечыўшы іх падрыхтаванымі кіраўнікамі.

7. Паставіць пытанне перад ЦСПСВ аб арганізацыі гурткоў па вывучэнні новага правапіса ўсімі работнікамі дзяржаўных устаноў, кааперацыйных, прафесіянальных і грамадскіх арганізацый.

Нам. наркома асветы ДУНЕЦ.
Кіраўнік справамі ПАЛЯЎЦОЎ.

СЕНСАЦЫЯ! ДЗЯРЖЦЫРК СЕНСАЦЫЯ!
АД 20-га ВЕРАСНЯ СУСВЕТНЫ АТРАКЦЫЁН
УСМІРАНЫЯ ДРАПЕЖНІКІ
Толькі 15 дзён — Берберійскія веліканы 7 родзіх экземпляраў — ЛЬВЫ — Толькі 15 дзён
Папулярны совецкі усмірыцель-дрэсіроўшчык дзікіх звяроў БАРЫС ЭДЭР.
Звяры працуюць у вялікай жалезнай клетцы.
У ПРАГРАМЕ ПРЫМЕ УДЗЕЛ ВСЯ ТРУПА
Сатырыкі АД І МАР новы рэпертуар | Людзі мячыкі 5 МАСЛЮКОВЫХ | Лопен-дэ-лоп МІРОНАВЫ
І яшчэ 10 розных нумароў. Пачатак а 6-30 г.

„Чырвоная Зорка" Каса—ад 1 г. дня. — НАРАБЕЛЬ КАРАЧОНЫХ драма ў 7 частках
Дзіцячы тэатр КІНО ТЗАЛЫ — МЯЦЕЖ паводзіны Ц. Фурманава 19, 20 і 21 верасня
Кіно Інтэрнацыянал — НІБЕЛУНГІ 1-я серыя—„Зігфрыд"
Кіно Пролетарый — Замежны мастацкі фільм ПРАВІЦЬЦЯ У СТАЛІСЫ Драма ў 6 частках
„СПАРТАК" Каса з 4 г. дня. — Замежны мастацкі фільм ДЗЕЛАВЫ ЧАЛАВЕК камедыя ў 6 частках

МАГІЛЕЎСКІ ЗАВОЧНЫ МЕДПАЛІТЭХНІКУМ
абвяшчае набор студэнтаў на аддзяленні:
1) фармацэўтычнае—200, 2) пам. урача гігіенолага—100. Прыём заяў праводзіцца з 15 верасня па 1 кастрычніка. Да заяў трэба прыкласці дакументы: анкету ў 2 экз. заверэную совецкімі або прафесіянальнымі арганізацыямі і асвятчэння дакументы згодна правіл прыёму ў тэхнікумы; паштовых марак на 40 кап. Іспыты адбудуцца па матэматыцы, фізіцы, гранамазнаўстве, беларускай літаратуры па пісьмовых заданнях за 7-годку. Курс навучання паўтара года. Заняткі пачнуцца з 1 кастрычніка 1933 г. Заявы накіроўваць па адрасе: гор. Магілеў н-Д медпалітэхнікум.
Дырэкцыя.

ІНСТЫТУТ ПРАМЫСЛОВАСЦІ БССР
утварае
набор аспірантаў
па наступных спецыяльнасцях:
Экзаменты ў галіне швейнай, тэкстыльнай, скуранай, абутковай і парфюмай прамысловасці.
Для залічэння ў аспіранты неабходна закончаная вышэйшая эканамічная асвета і пажадана практычная работа ў пералічаных галінах.
Аспірантская стыпендыя ў памеры да 300 руб. Прыём заяў да 15 кастрычніка г.г.
Асвятчэ умовы прыёму агульныя.
Адрас: Менск, плац Волі 21-1, інстытут прамысловасці.
Дырэкцыя.

БЕЛАРУСКІ ВУЧЭБНЫ КАМБІНАТ СУВЯЗІ
абвяшчае, што ў сувязі з рэарганізацыяй школы ФЗВ сувязі,
НАБОР ВУЧНЯЎ У ШКОЛУ ФЗВ СУВЯЗІ
працягнуты да 25 верасня.
Школа ФЗВ сувязі рыхтуе кваліфікаваных мантэраў па спецыяльнасцях: тэлефаніі, тэлеграфіі, радыё і рахункова-работнікаў для гаспадаркі сувязі. Прымаюцца рабочыя, калгаснікі, сувязісты і іх дзеці ва ўзросце ад 16 да 19 год на базе 7-годкі. Пачатак заняткаў 1 кастрычніка.
Адрас: Менск, Камароўка (каля клінікі). Ласная вул. д. № 28, тэл. № 22-576.
ДЫРЭКЦЫЯ.

АНОНСІ — ГЭТЫМІ ДНЯМІ

У сувязі з ліквідацыяй філіяла ЛЕНКРАЙДАМЭЦ'а па БССР і стварэннем Беларускага аддзялення ДАМЭЦ'а з 1-га верасня г.г.
усе ўстановы, прадпрыемствы і прыватныя асобы павінны падаць мяжчэся-да філіяла ЛЕНКРАЙДАМЭЦ'а прэтэнзіі не пазней 25 верасня.
Пасля паказанага тэрміна ніякія прэтэнзіі прымацца не будуць.
БЕЛДАМЭЦ.

У аддзел аб'яў званеце па тэлефону 21-360

ТАБЛІЦА

20 ТЫРАЖА ВЫЙГРЫШАЎ пазыкі „3-га, рашаючага года пяцігодкі" (бяспроцантка-бяспрайгрышнага выпуску). Тыраж адбыўся 10 і 11 верасня ў г. Іркутску.

| №№ серый | №№ аблігацый | Сума выйгр